КАЛОСЬСЕ

ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

КНІЖКА 3

ВІЛЬНЯ 1935 ГОД.

Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная вул. № 1—2.

Падпіска на год—4 зал., на паўгода—2 зал.
Адна кніжка—1 зал.

Часапіс выходзіць раз у тры месяцы.

ЗЬМЕСТ

Белар. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

Кніжка 3. **1935 г.** **Год I**

ХВЕДАР ІЛЬЛЯШЭВІЧ

Васеньняя поэма

Неба — сіні плякат —
Серабрыстымі ніткамі выткала
восень —

Яблык сьпелы ў руках
Басаногая дзеўчынка ў вуліцы
носіць —

У жоўтым лісьці гарыць
Белы вечар, напудраны заравам
раньня —

А ўначы — на драты
Начаваць разьлятаюцца зоркі
ў тумане —

З вуліц — рыжых іржышч
У прастор крыкнуць хочам штось нема
табе мы —

І ізноў у душы
Ападаюць разьдзелы васеньняе
поэмы —

1935.

* * *

Зацьвітай, родны край, зацьвітай,
Гінуць годзе ў завеі і сьцюжы,—
Хай далінамі сонечны май
Успалымнее вагнямі ружаў!

Ў тваіх песьнях—нядолі іржа—
Уздыхні-ж песьняй новай, вясёлай.
Раздавайся юнацкі наш шаг
Па дарогах радзімых сёлаў!

З моцнай верай у лепшыя дні
Беларускую даль ускалосім—
Ў электрычным скупаем агні
Твае постаці цёмныя вёсак.

І на шыбах заплесьнеўшых хат
Сядзе радасьць вясёлкай ірдзістай—
У паходны расходзьцеся тахт
Пераборы рукі цымбаліста.

Зацьвітай, родны край, зацьвітай,
Гінуць годзе ў завеі і сьцюжы!
Хай далінамі сонечны май
Ўспалымнее вагнямі ружаў!

935

* * *

Па вёсках Беларусі
Сялянскі едзе воз.
На ім труна ў дзярузе —
Ў труне той — поўна сьлёз.

Ляжыць на веку ліра —
Ў ёй струнаў цэлы рад.
Галосяць яны шчыра
На нашаніўскі лад.

Выходзяць людзі гурмам
І жаласна глядзяць,
А гэты воз хаўтурны
Здалёк усё чуваць.

1935

МІХАСЬ МАШАРА

З ЦЫКЛЮ „ВЯСЬНЯНКІ“

* * *

Як не кажы,
Якіх ня роб там прыпушчэньняў,
А ад мяжы і да мяжы
Хвалюе сэрца Адраджэньне.

Вось хоць-бы я,
Унук прыгоньнікаў звычайных,
А Муза звонкая мая
Ня знае сёньнека адчаю.

Зьвіні, зьвіні,
Мая бунтуючая ліра!
На вазе сёньня нашы дні
І переважуць праўдай шчырай.

Ідзе з цямры
З гарачым сэрцам надта многа,
Ідуць шукаць свой шлях яны
І ня стрымае іх нічога.

Дык хай душа,
У бунце песельным згарае!
Бо хто ня мае ні шыша,
Шчасьлівы тым, — што страт ня знае.

Я рады — тым,
Што я ня ў неба пальцам торкаў,
А быў, як трэба быць, — жывым
Ў наш час нярадасны і горкі.

Аддам усё,
Хоць сьветлай радасьці ня знаю.
Калі ў крыві бруіць жыцьцё, —
Над чым-жа плакаць сяньня маю?

* * *

Прышла вясна. Вясна прыгожая,
Цьвітуць навокал ўсе сады,
А сэрца радасьцю у кожнага,
Хто духам чыст і малады.

На полі ціш... Цяпло — чароўнае...
Чувацца нават рост травы

І самі просяцца пакорныя
У верш — узорныя славы.

І вёска ўся ізноў рухлівая,
Калышыць даль яе шляхі.
І як папы крыклівыя
Пяюць малебен пятухі.

Лунае сьмех і радасьць звонкая
На вуліцы — дзяцей.
Рассыпалась вясёлкамі
Вясна ў вачох людзей.

* * *

Праскакаў лівень вясьняны,
Аджыла ізноў зямля.
Чымсь таёмна ўсхваляваны,
Чагось надта рады я.

Страхануў з душы клапоты;
Ўвесь жыцьцёвы грэх і сум,
Ціхай сьветлаю пяшчотай
Прывітаю веснашум.

Навакол палі рунеюць,
Красак бель і чыстата.
Ад красы душа хмялеець,
Каля кожнага куста.

Столькі радасьці і сонца
На палёх, лугох у нас!
Эх вы, бледныя мястоўцы,
Як цяпер мне шкода вас!

* * *

За сялом палосы,
З баразной пачатай
І снуе, як кросны,
За плугом аратай.

Ветла ў твар касматы
Заглядае сонца.
— Гэй, мой конік, кратай
— Ў роўнай баразёнцы.

У канцы з суседам
Пусьціць дым з махоркі,
А там бач — з абедам
Ўжо надходзяць жонкі.

Ну прысесьці-ж трэба,
Пэўна-ж, з жонкай разам.
Кашу з чорным хлебам
Запівае квасам.

А пад'еўшы — гэтак,
Ветла жонцы кажа:
— Занясі-ж і дзеткам,
— Бо смачная каша.

* * *

Пад старой бярозай,
Над ракой шырокай
З дзеўчынай прыгожай
Хлопец сінявокі.

Заглядзелісь ў тоні
Рэчанькі бягучай:
— Ты скажы — сягоньня,
— Сэрца мне ня мучай! —

Ён — дзяцюк звычайны,
Яна-ж — не графянка:
— Ты адзін — каханы,
— Ты — мой любы Янка.

З сонечным прылівам
Вецярок шапочыць,
А у іх — шчасьлівым
Зацьвітаюць вочы.

* * *

Чуеш брат малады,
Як бурліў і зьвіняч веснашум?
Няма слёз,
Ні нуды,
Ні бяды.
У душы
І ў крыві,
Толькі хмель разхвалёваных дум.

Мы стаім перад тайнай сьвятой
Адраджэньня — жыцьця —
Ад таго і ў грудзях непакой,
Ад таго і прыбой
За прыбоем ў крыві пачуцьця.

* * *

Панад вуліцай вясковаю
Распусьціліс тапалі.
Кожны дзень — то радасьць новая
На аджыўшай зноў зямлі.

Зноў над ліпамі ірдзістымі
Зазьвінеў пчаліны рой,
Неба сонечна і чыстае
Сінім морам над зямлёй.

Над палямі, над зялёнымі
Веснапесьні жаўрука,
Ўжо ня надта так стамлёны
Твар працоўны мужыка.

Вецер шэпчыць штось пяшчотнае
Расхвалёванай траве,
Штосьць блізкое — надта роднае —
Ёсьць ў вясьняным харастве.

Вось аселіца ля порама, —
Як аджыўшы луг прыгож!
І абняць зусім нясорамна,
Як дзяўчыну — стан бяроз.

* * *

На вуліцы сьвяткуючы,
Сабраліся сяляне,
Аб тым, аб сім талкуючы —
Настрой усіх вясьняны.

Парэнчу прыдарожную
Пад вербаю абселі.
Наўзбоч сьцяной прыгожаю
Стаіць вішняк у белі.

Кашулі палатняныя
Дабелівае сонца.
У ветра песьні п'яныя
І радыя бяз конца.

Журчаць славы пагодныя,
Журчаць славы жывыя,
Як вецярок — лагодныя
І як вясна жывыя.

А там прыпеўку модную
Дзяўчаты запяялі.
Калышуць песьню родную
Лясы, палі і далі.

* * *

Як вось цьвітуць сады вясной,
Як вось пад бельлю пышнай вішні,
Здаецца мне — ў сям'і людзкой
І я патрэбны і ня лішні.

І так салодка жыць і чуць
Ў крыві юнацкія прылівы,
І хоць кароткі надта пуць,
А ўсё-ж жывы — жыцьцём шчасьлівы.

Я рады чуць сябе жывым,
А наша лучнасьць гэта з цьветам
Адзін выразны сынонім
Між камаром — і ўсім сусьветам.

Салодка чуць і разумець
Ўсю гэту лучнасьць між жывымі,
Калі вясна калышыць брэдзь
Цьвятоў і песьні салаўінай.

Тады кахаю я усё,
Дзіцячай радасьцю бяз маскі.
Вітаю песьнямі жыцьцё
І веру ўсім прыгожым казкам.

СЁМУХА.

У сонцы купаецца вёска,
Пахне прыемна язьмін.
Раніца... чыста дарожка,
Неба — бяздонная сінь.

Сёмуха сёньнека — сьвята.
У красачнай белі сады.
Тонуць у зелені хаты,
Зелень хвалюецць палі.

Тоўпамі, з вёсак па сьцежках,
Моладзь па полі плыве.
Вецер вандроўнае нешта
Шэпчыць залётна вярбе;

Да дзевак падскочыць дуронік
Раптам сукенку задзьме.
Хлопцы рагочуць — шалёны!
Сорамна нам за цябе.

Далі нясецца па нівах,
Зелень хвалюе жытоў;
Песьню сьпявае аб дзівах
Зноў зацьвіцеўшых палёў.

1.VI.35.
Таболы.

* * *

В. К—ЧУ.

Не хвалюй майго сэрца жальбой
Сумных песень аб роднай Краіне;
Глянь, як пышны пад новай красой
Зацьвіцеўшы язьмін і каліна.

Што ў мінулым было, то прайшло,
Хоць пакінула чорную памяць.
А цяпер мы ідзём у жыцьцё
Нашу радасьць вясьняную славіць.

Дык спакінь свае песьні жальбы
І ня кратай мінулага болю,
Мы цяпер на шляху барацьбы
За жыцьцёвую радасьць і волю.

Пэўна кінеш дакорам ты мне,
Што ня бачыш тэй радасьці сёньня.
Глянь навокал! — Краіна жыве,
А нядаўна ляжала ўся соннай.

2.VI.35.
Таболы.

* * *

Знаю, знаю, я ня першы
Бескарысна так крычу,
Біць-бы ў сэрцы вам ня вершам
А... ды лепі прамаўчу.

Лепш схаваю гэту тайну
Ў сэрцы з крыўдаю на дне.
Што здаецца вам звычайным,
Чаму ж мучае мяне?

* * *

Едзе шпарка там хтось па дарозе,
Так разгоніста бомкае медзь.
Наша моладасьць хутка праходзе
І ня ўбачыш, як станеш старэць.

Не вярнуць нам на‘т мігу з учора,
І ня знаем, што заўтра нясе.
Пераажытыя радасьць і гора,
Заціхае і гасьне ў працьме.

Што быцьцё? што імкненьні ўсе нашы,
З прагавітаю смагай жыцьця?...
Зацьвіціць, адцьвіціць і заляжыць
У бяздонную муць забыцьця.

Хтось праехаў з званком па дарозе,
Адзьвінела і сьціхнула медзь.
Ўсё жыцьцё наша гэтак праходзіць.
І ня ўбачым, як пройдзе — мінець.

А. БЯРОЗКА.

НОЧ ІДЗЕ...

Прасьцягам палёў бесканечным
Цёмныя цені крадуцца, паўзуць, заліваюць
Воблакі, неба, зямлю... А на захадзе ў цемры канаюць
Іскры апошнія дня. Песьняю казкай адвечнай
Лес-багатыр зашумеў. Ціха на ціхай вадзе
Вецер ў аеры шуміць і шасьціць...
Ноч ідзе...

Вось ужо блíснулі зоры і вецер улёгся гульлівы;
Не скалыхнецца ў цішы палахлівы асіны лісток.
Месяц у хмарах заграз і злавесна свой стомлены ўзрок
Стужкамі сумнымі льле... Пахіліўшысь над соннаю нівай
Шэпчуць бярозы-сіроты, што вецьцем чуткім спляліся:
„Ноч ідзе!.. Цемра ідзе!.. Сьцеражыся!..“

---

* * *

На раскутай з пад сьнежных пялёнаў зямлі
Нова-ўстаўшая рунь зелянее;
Ў цёмнай гушчы лясной, у цішы расьцьвілі
Кветкі-зоры вясны — расьцьвілі канвалеі.

Доўга з бурамі жорсткую спорку вялі
Дубы — старцы лясныя, натужыўшы грудзі;
Доўга хмары ліхія над полем злавалі
І шалёна круціліся кудасы хвалі,
Ў вочы небу сьнягамі мялі...

Прамінулі і шчэзьлі...
Як мары...
Як людзі...

Ідзе дзень... Ўстануць руні на нашых палёх!..
Вецер хмары-нягоды разьвее,
Сьлёзы — сонца абсушыць... Магутны араты
Выйдзе з песьняй і плугам з прабуджанай хаты
Новы шлях праараць між цярністых дарог...
Расьцьвітуць канвалеі...

11.V.35.

* * *

Вось ізноў плачуць струны гітары тваей
Як калісь,
Ў тыя дні, калі білася сэрца жывей,
Калі мроі пляліcь...

І пяюць тваe струны нясьмелай жальбой
І акордамі ціхімі сьняць аб мінулым...
Мо' шкадуюць, што доля жалезнай рукой
Ў пыл і попел надзеі твае абвярнула?

О, ня йграй гэтак сумна, ня йграй,
Мук і ценяў былых не ўскрашай!

Бо даўно прамінулі яны, як імгла —
Заснавалі іх часу туманы;
Сонцам новага дня на душу ціш сплыла,
Загаілісь балючыя раны.

Ды вось зноў плачуць струны гітары тваей,
Як калісь,
Ў тыя дні, што стралою між бур і завей
Пранясьлісь...

29.IV.35.

З Усходняе Беларусі

СЫМОН БАРАНАВЫХ *)

Прысады

Міхалка ня мог дачакацца Андрэя. Тупаў каля маладога саду, рукі цёр ад сіверу, а таго Андрэя ня было.

— Чалавек... — бурчэў сабе пад нос Міхалка Белячок. — От-жа мешкаваты чалавек! Можна было справіцца за гэты час дзесяць разоў...

Вецер, здаецца, наўмысьля злаваў Міхалку: — быў вельмі-ж золкі, халодны, як тое жалеза. І бадай таму быў золкі сівер, што ішоў ён з рэчкі Галай, з поўначы.

Малады калгасны сад — вось-жа ён — над крутым берагам рэчкі. Можа трыццаць якіх крокаў ад саду да рэчкі. Некалі быў тут гарод фальваркоўца Пліса. Агарод быў абсаджан ад рэчкі ліпамі, між ліп сустракалася, часамі, і бяроза.

І ўсё гэта было ў Плісавых руках аж да самай рэвалюцыі. А прыйшла рэвалюцыя — адабрала ад Пліса ўсю зямлю з прысадамі, з хараствам, ды аддала ўсё гэта карзюкоўцам у рукі. Толькі карзюкоўцы, — яны і самі ня ведаюць, куды дзеліся, куды зьніклі прысады. Зямля, вось, засталася, агарод застаўся; і на гародзе гэтаю вясною пасадзілі малады сад; а прысады — нібы іх у адну навальнічную ноч некуды зьнесла бураю. Бо гэта-ж так даўно было... Нават калі сказаў, гэтымі днямі, Міхалку, брыгадзір Банэдзік, што трэба засадзіць ад рэчкі прысадамі, той ажно лыпнуў вачыма.

— Як-жа гэта... Нашто тыя прысады!

Чамусьці здалося Міхалку, што прысады растуць там праз увесь час. Але ён не дагаварыў, быў, сваей думкі.

— Дапраўды—успомніў ён,—ня відаць нешта такі тых даўнейшых прысадаў.

Ён папраўіў тады на поўслове сваю разгубленасьць і дагаварыў:

— Але-ж... гэта-ж вецер дзьме цэлы год з гэтай Галай. А наш малады сад, канешне, можа вымярзнуць.

---

*) Хоць ідэолёгія калгаснага ладу, выражаная ў „Прысадах“, ёсьць нам чужая, друкуем тут гэты твор дзеля яго мастацкае вартасьці і пазнаямленьня чытача з даволі выдатным беларускім пісьменьнікам. Сымон Баранавых — гэта адзін з лепшых маладых беларускіх прозаікаў Усходняе Беларусі. Да лепшых яго твораў належыць повесьць „Межы“. „Прысады“ перадрукоўваем із часапісу „Полымя Рэволюцыі“, кн. 4, 1935. Рэдакцыя

І вось яны ўдвух з Андрэем Верамейчыкам былі вызначаны на пасадку дрэў. Учора і пазаўчора яны ўдвух капалі ямкі і клялі тых людзей, што пазразалі такія-та ліпы.

Прыселі, былі — Андрэй на старым ліповым пні, а Міхалка каля Андрэя на куркішках—круцілі папяросы ды:

— Я памятую,—казаў Міхалка, закручваючы канец папяросы,—тут вось такая, такая была ліпа! Гладкая і тоўстая. Адзін не абдымеш. Мусіць нехта зрэзаў яе на начоўкі.

— Ёсьць што гаварыць,— даючы Міхалку прыкурыць, казаў Андрэй, — усе яны былі адна ў адну. З іх і начовак нехта нарабіў і дыляў навыразаў.

— Дзіва што навыразаў!—выпускаючы праз нос збэрсаныя пасмы дыму, сплёўваючы асеўшыя на губе карашкі, праказаў Міхалка.—Дылі... ого! З ліповых дыль які можна зрабіць тапчан. Унь у Ахрэмчыка ліповы тапчан, жоўты, як жаўток. І ніколі не пацямнее.

— Каб ён жытла ня ведаў, хто гэта пазразаў!

— Дай-жа ты рады... Каб яго рэзала рэзь!

— Пакуль-жа яны, цяпер, вырастуць!

— Вырасьці то вырастуць. І яшчэ, ведаеш, лепшыя як былі. Мы іх пасадзім—будуць адна ў вадну! Толькі вось адразу ня будзе зацішна саду нашаму...

— От, ёсьцяка-ж на сьвеце ўсякія злыдні!

— Уга! Яшчэ-ж і якія!

Памаўчалі. Сівер дзьмуў з рэчкі. Восень ужо зусім сьмела хадзіла каля рэчкі Галай. Гальлё пад нагамі, лісты — усё было мокрае. Гэта-ж цэлую ноч быў надакучлівы золкі дождж-імжак.

Першым узьняўся на ногі Міхалка. Ён тужэй зацягнуў па сваёй салдацкай ватоўцы папругу, нязручна неяк крутнуў рукой у паветры, праказаў:

— Каб застаў такога чалавека... я-б такога гада на дзесяць год!

Узьняўся з пня таксама і Андрэй. Кінуў акурак на мокрае лісьцё, скрозь зубы сплюнуў ды:

— На дзесяць, не на дзесяць, а на пяць год упёк-бы.

Акінуў цэлы шар выкапаных ямак—нібы зважыў сваю сілу, што аддаў на гэтыя ямкі, дагаварыў:

— Такога чалавека, лепш за ўсё—самасудам. Прыпілнаваў, злавіў, адняў глузды і няхай, тады, сохне, як гэты пень! І больш нічога!

Прайшло ўжо, бадай, больш гадзіны, а Верамейчыка Андрэя ўсё-ж ня было. Міхалка, чакаючы яго каля ямак, зусім зьмерз. То сюды, то туды тупаў каля ўчарашняга пяску, рукамі разводзіў—зводзіў, як малады фізкультурнік і—ня мог сагрэцца. Ён агонь расклаў-бы, дык было тры запалкі—галоўкі пазьляталі. Мусіць адсырэлі.

Ужо плюнуў на ўсё, Міхалка, халодную злосьцю—ісьці хацеў дадому, у калгас: „хай тады адзін садзіць!".

І нават ступіў, азіраючыся, некалькі крокаў, аж—едзе Андрэй. Вунь паказаўся ён з за ўзгорку з маладымі прысадамі.

Маладняк на прысады капаў Кандрацюк з Рыгоравым Лявонам у Грабеншчыне і Андрэй паехаў па яго. Тут-жа поўгадзіны язды, а ён, немаведама дзе прападаў. Як паехаў Андрэй па прысады, Міхалка яшчэ унь колькі быў на калгасным двары. Канюх Лаўрык чысьціў каля канюшні жарабца Ляха, а Міхалка да яго зайшоў, закурыў. Гаварылі тое-сёе... Пра кабыліцу Муху, што добрае будзе племя ад Ляха, пра грузавік, што прыбыў для калгасу на шаснаццаты разьезд. Потым пайшоў Міхалка павольна да гэтых ямак і вось...

— Дзе цябе трымала тое, нядобрае! — яшчэ здалёку, калі пад'яжджаў Андрэй, накінуўся Міхалка.—Гэта ж можна было за гэты час зьезьдзіць аж у Анупрова і назад прыехаць! От-жа чалавек!

Андрэй пад'ехаў да самых ямак, злосна смаргануў каня, застанавіўся.

— То трэба было самому ехаць, калі такі спрытны. Стой!— крыкнуў ён на каня ды больш заспакоеным голасам:—Прыехаў, а яны-ж не накапалі. Яшчэ трэ' было выкапаць тры штукі. А потым усклалі, выехаў з лесу, гляджу—рэхва... Скінулася з кола рэхва. Добра, што агледзеўся. Дык пакуль узагнаў яе з большага, камянем...

Міхалка кінуў беглы позірк на кола, ступіў двумя крокамі да Андрэя:

— А табе трэ' было запрэгчы ў новую драбінку, а ня ў гэта стар'ё.

Пераступіў з нагі на нагу і з большым задорам:

— Ты тут яго чакай, а ён майструе старое кола! А што-ж тады будуць рабіць нашы кавалі?

Падбіраючы лейцы, завязваючы іх за поўшары, Андрэй не сьцярпеў:

— Няхай сабе і старое, але гэта-ж мае калёсы. А я не хачу, каб мая снасьць была без дагляду?

— Што твая, то твая, — з усьмешкай праказаў Міхалка. — Я добра памятую, як ты, будучы аднаасобнікам, фарсіў на ёй. Бывала—дзьве лёсткі з аднаго боку, поўтары лёсткі—з другога... без перадка, без задка—пыл ажно курыць! Але якая-ж яна цяпер твая. Тым больш, што калгас паўстаўляў ёй новыя лёсткі. Хіба ты не абагульваў яе, ці што?

Андрэй разгубіўся:

— Пры чым тут „абагульваў“, не „абагульваў“!

Ён раскілзваў Беляка, не ўзьнімаў на Міхалку вачэй, гаварыў:

— Няма табе чаго, вельмі, выскаляцца, як і на чым езьдзіў я. Ня вельмі ўжо і ты езьдзіў... Ды і ня думай сабе, што такая работа аднаго толькі каваля. Таксама—гаспадар!

Міхалка не адказаў. І ў гэтай маўклівасьці Андрэю здалося,

што ўзяў ён над ім верх. Тады яшчэ, нібы сам сабе, марматаў пад нос:

— Гаворак тых колькі хочаш! Абы сход—кожны і гаворыць: трэба глядзець у калгасе, трэба даглядаць за ўсім усякім. Адзін аднаму гаворыць. Лепш чым гаварыць, глядзеў-бы...

Апошніх Андрэевых слоў Міхалка ня чуў. Ён ізноў пады-шоў цяпер да кола. Нібы хацеў зрабіць ён праверку:—ці сапраў-ды ськідвалася рэхва, і чаму яна ськідаецца?

А рэхва была ўзьдзета на калодку кола касяком. Ведама, камянем узганяў яе Андрэй — нязручна было. Яна толькі для прыкляпу трымалася на коле. Ад яе колу ня было ніякай ка-рысьці. Рэхва гэта і сьвінулася мусіць ня з тэй прычыны, што рассохлася кола. Вось-жа яна—ніт... Некалі была відаць зьніта-вана не ў каваля, не агнём, а дрылем — самадзельна, самым гаспадаром.

— Гэта-ж мая рэхва!—нечакана ні для сябе, ні для Андрэя, вырвалася з Міхалкавых вуснаў.—Дзе ты яе ўзяў?

Адзін аднаму, момант, пазіралі ў вочы. Андрэй першым узрушыўся з месца. Як быў на тым баку драбінкі, перайшоў на гэты бок. Яго апанавала раптоўная злосьць.

— Твая?! Як-жа гэта „твая“? Гэта-ж былі некалі мае калё-сы і яна мая, а не „твая“!

Стаялі каля кола хвіліну, ня зводзілі вачэй з рэхвы. Потым Міхалка не сьцярпеў:

— Ён будзе мне яшчэ гаварыць! От-жа—ніт. Я сам дрыля-ваў! Нават памятую—ня было падхадзячага цьвіка для ніту, дык свайго хлапца пасылаў к Юзіку. .

І раптам, як узьняў, так і абарваў свой голас. Нібы яму стала няёмка, што з-за гэтай рэхвы такая спрэчка, нібы нешта прышло на розум, успомнілася. Ён нават на цэлы крок адсту-піўся ад Андрэя.

— Твая, дык, няхай сабе, твая,—сказаў заспакоеным гола-сам.—Я-ж яе ад цябе не адбіраю.

Такі раптоўны пераход Міхалкавай гаворкі не задаволіў Андрэя. Андрэй хацеў давесьці, што няхай ня думае Міхалка, ні-бы ён украў у яго гэтую рэхву.

— Што ты мяне, вельмі, робіш тым злодзеем ці што?—ска-заў Андрэй,—на якое ліха мне твая рэхва. Я яе, калі на тое пай-шло, знайшоў. І тут, вось... яшчэ калі былі прысады, пасьвіў каня і знайшоў.

Па Міхалкавых вуснах прабег штучны сьмех. Ён адвярнуў-ся, ступіў да перадка драбінкі і пазіраючы на маладыя ліповыя дрэўцы:

— Ніхто цябе тым злодзеем ня робіць. Чаго ты крычыш? Усё адно яна цяпер твая і мая. Падумаеш—ёсьць аб чым гава-рыць! Бяры, вось, давай будзем садзіць!

...Цэлы дзень садзілі маладыя ліпы і больш пра рэхву не гаварылі. Гаварылі пра Пліса... якія некалі тут, у Пліса, расьлі

агуркі. Гаварылі пра рыбу... невядома ці будзе ў гэтым годзе чысты лёд, ці будуць глушыць рыбу. І кожную гаворку пачынаў Міхалка. Пачынаў і на тым канчаў. Неяк ня клеілася гаворка. Ня было спрэчак, альбо каб з пачатай гаворкі нарадзіліся новыя ўспаміны ці сьвежыя думкі.

А самым зьмерканьнем перад канцом работы, закурываючы Андрэй сказаў, што гэты год у яго будзе ўмалотным:

— На сто сорак працадзён больш як у мінулым годзе. От калі яшчэ з месяц працягнецца да гадавога падліку — наскрабу каля васьмісот.

— Каб я, гэтак як і ты, — утраіх ішлі штодня, — Міхалка ўставіў спачуваючае слова, — і ў мяне ня менш было б ..

І як і пра што яны не гаварылі, Андрэю ўсё-ж рупіла рэхва. Яму хацелася ўвесь час проста і адкрыта сказаць Міхалку: „Што ты мне загаварваеш зубы. Ты, чалавеча, быў з канём, зразаў ліпу і згубіў тут рэхву. Ты думаеш, што ты разумны, а я дурачок і нічога не разумею“. Толькі ніяк ён ня мог гэтага выказаць. Можа таму ня мог, што ён таксама быў вінават. І нават невядома, хто з іх двух больш вінаваты. Хоць Андрэй і ня лічыў сваёй віны за віну, але ўсё-ж яна непакоіла яго. Андрэева віна цяпер загарэлася тарфяною іскраю—(ня відаць, а пякучая)—і тлела недзе глыбока ў яго нутры.

Было гэта, бадай, калі адлістаць гадоў з восем назад. Неяк пасьля захаду сонца Андрэй навастрыў нож і вышаў з хаты.

Па зямлі ўжо разаслаўся вячэрні змрок, а на траву пала раса. Густымі пластамі ўздымаўся ад рэчкі туман. Недзе ў чаротах рэчкі, а мо‘ ў аеры—трашчэў драч.

Андрэй ішоў паўз рэчку, поплавам, а як параўняўся з ліповымі прысадамі—спыніўся. На адным месцы прастаяў хвіліну,— нібы лавіў невядомы, схаваны шорах чаротаў—глядзеў у адзін бок, у другі—слухаў. І калі пераканаўся, што ніхто яго ня бачыць, — хутка закрочыў напрамкі, па густой траве, да ліповых прысад. Ён нават і не заўважыў, што ішоў па высокай траве, што абрасіў калошы сваіх зрэбных порткаў да самых кален. Ён сьпяшаўся: — „хаця-б хто не падгледзеў“. А калі падышоў да першай ліпы, забыўся на ўсё. Андрэй любаваўся ліпаю. Яна была ў самым цьвеце. Над ёю гулі вячэрнія хрушчы ..

Андрэй яшчэ раз і яшчэ—уважліва аглядзеў дрэва. Потым нож заткнуў за папругу, якой падперазаны былі яго порткі, сплюнуў на даланю, пацёр сьліну і палез па гладкім камлі дрэва аж у гушчар лісьцяў, цьвету.

— Ах, якія хвацкія сукі!—рукамі мацаючы ліповую кару цешыўся Андрэй,—не сукаватыя, маладыя... З аднаго такога сука— пара лапцей!

Зручна ўсеўся на суку ды ў сваіх думках:

— Ні стуку, ні груку... Ніхто нават і не падумае на мяне Усё адно нейкі лысы чорт будзе спажываць гэтыя лыкі. А чаму ня я?

За якую гадзіну Андрэй абабраў усе лепшыя сукі, і калі зьлез з ліпы, не паверыў сам сабе. Вельмі-ж кідалася ў вочы ліповая бель у вячэрнім змроку! Здавалася, нібы нехта ўсьцягнуў на зялёную, цьвітучую ліпу шкілет нейкага вялікага зьвера. Нават на момант зрабілася жудасна.

Тады хутка пакруціў ліповыя луты ў вярчы. Цэлае вышла вясло. Нераўнуючы, як вясло тых кірмашовых абаранкаў.

Дадому ідучы разважаў:

— З такога вясла... з такога вясла выйдзе дзесяць пар лапцей. А мо' нават і больш!

Вось чаму ня важыўся Андрэй і выказаць Міхалку сваёй думкі. А віна Андрэява была большая за Міхалкаву і вось у чым:

Карзюкоўцы, тады, абадраную ліпу заўважылі толькі праз два дні. Ня было мусіць нікому патрэбы хадзіць у рабочы час каля прысад.

Перш-на-перш убачыў белыя сукі Лявон Кірэйчык і сказаў Захару, а Захар Міхалку. Міхалка вельмі-ж зьдзівіўся такой рабоце: „Як не кажы—прысады ўсіх карзюкоўцаў“. Плісава зямля, канешне, падзелена, а прысады—агульная маемасьць вёскі.

— Каб застаў такога чалавека,—казаў Міхалка,—скуру злупіць з такога чалавека і то мала.

Гаворак было на некалькі дзён. Потым усе гэтыя гаворкі ўлягліся. Ліповыя прысады хутка адцьвілі і лыка на іх не адстала. Падыйшла восень з сваімі замаразкамі, і рэчка Галая замерзла. Цэлымі днямі карзюкоўцы хадзілі па чыстым лёдзе ды глушылі даўбешкамі рыбу. І неяк у адну такую марозную раніцу Міхалка быў на рэчцы з даўбешкаю і здалёк заўважыў абадраныя сукі ліпы.

— Яна напэўна сохне, — падумаў Міхалка і сышоў з рэчкі. Ён перайшоў мерзлы поплаў і падышоў да самага дрэва. Нібы першы раз ён убачыў яго.

— От-жа нехта абчысьціў, — пазіраў, галаву задраўшы, на аголеныя сукі.—Ну і людзі-ж...

Думаючы так, Міхалка нібы зьбіраўся выратаваць ліпу—загаіць яе балючыя раны. (Памазаць сукі тарпэтынаю, абвязаць сукі рагожаю, замазаць глінаю сукі). Бо вось-жа надыходзіць зіма і мароз бяз літасьці будзе смактаць мядовы сок з голага яе цела.

Але ў Міхалкі былі другія меркаваньні. Калі гаварыў думкамі сам з сабою, што сохне ліпа, і кляў чалавека, які абадраў яе сукі, — такімі думкамі цешыў сябе. Ён сьціраў перад ліпаю сваю віну, якую меўся зрабіць.

Яшчэ з лета, калі першы раз убачыў яе абадраную, насьпела думка: „З такой ліпы—ах начоўкі!“

Стоячы цяпер каля дрэва, Міхалка яшчэ раз і яшчэ акінуў

сьціплым позіркам ліповы камель. Ліпа была ў камлі вельмі-ж гладкая. Камель быў такі, што аднаму не абняць.

— Каб толькі, хаця, ня было дупля,—меркаваў Міхалка, ня зводзячы з яе сваіх вачэй. Яшчэ зірнуў і яшчэ:—не павінна! Ліпа маладая! Я-ж памятую, калі яна была яшчэ падліпкам. Тут зямля тарфяністая, яе і выгнала.

Тады абышоў наўкол, зірнуў на самы яе верх, потым адвёў вочы на дарогу, што ідзе за былым Плісавым агародам, і ў сваіх думках:

— І надвор‘е як наўмысьля! Зямля мерзлая і ніякага сьледу. Та-а-к... З яе можа быць..- адзін рэз, два, тры... З яе можа быць чатыры кавалкі па дзьве плашкі з кавалка,—васьмёра начовак. Ды ня тое, што асінавых начовак, а ліповых!

У тую ноч, як наўмысьля і вецер быў вялікі. Гуло ў камінох, а зямля яшчэ больш мерзла. І з тэй ночы першую ліпу прысад нібы зьнесла сіверным ветрам. Больш ніколі не палохала яна ўначы сваімі абадранымі сукамі.

Міхалка, цяпер, добра ведаў: канечне, ён згубіў рэхву як рэзаў тую ліпу.

Колы Міхалкавай драбінкі тады патрэбна было перацягваць. І шына на яго колах чапалася. І рэхвы на калодках ледзь ліпелі. Калі ня было маразоў—гразь была—замочацца колы і нічога. А прыўдарылі, былі, марозы,—зямля стала грудаю, рагляком. Дык недзе едучы раздрогалася, а тут зачапілася ў кустох і згубілася.

Праз увесь дзень Міхалка думаў і ня выпускаў з галавы:

— Пацягнула мяне нядобрая за язык! Нібы ў мяне хто пытаў—мая гэта рэхва, ці не мая! На якое ліха яна мне, як калгаснаму чалавеку, патрэбна, хоць сабе і мая?

Міхалка ня ведаў, што Андрэй абадраў ліпу. Каб ведаў ён—малы клопат быў-бы. Ды які клопат?—Уся віна была-б Андрэева: „Патрэбна было ня драць, а ён-бы яе і ня рэзаў“! Міхалку проста рупіла: цэлы дзень Андрэй такім насупістым. Буркне слова, другое, ды маўчыць. Міхалку ўвесь час думалася, што Андрэй напэўна мяркуе: ,,Міхалка рабіў бандарку і ён пазразаў усе прысады на клёпкі“.

Нават аж крыўда агарнула. Ён добра памятае: на другую ноч, як зрэзаў тую абадраную ліпу, нехта зрэзаў аж дзьве ліпы. Тады была заварушылася ўся вёска. Гаварылі: ,,Трэба прыпілнаваць“! І Міхалка канечна не палез больш у гэту бяду. Бо і сапраўды хадзілі пілнаваць. Макась, што жыве каля Гіляра, дык хадзіў, каб ніхто і ня ведаў. Яго цікавіла ня толькі тое, каб злавіць чалавека, а каб і ведаць, хто мае такі спрыт. Потым Макась выехаў на настаўніцкія курсы, прайшоў тыдзень, другі — і зноў нехта зрэзаў дрэва. Пачалі менш гаварыць, нібы ў закон увайшло сяды-тады рэзаць па аднаму, па два дрэвы. А пакуль ішла маруднаю хадою зіма, ад рэчкі ачысьцілі ўвесь бераг.

І нават зусім пакінулі дзівіцца.

Так і зьніклі, невядома дзе дзеліся, ліповыя прысады.

. .Калі зьбіраліся сёньня садзіць прысады, і ў думках ня было, што скончаць яны такі доўгі шар. Брыгадзір Банэдзік так і разьмеркаваў—„на два дні“. Ім і самым ня верылася, як гэта яно здарылася.

А яны садзілі прысады з нейкім нявыказаным імпэтам. Міхалка сваім спрытам хацеў сказаць Андрэю: „Ты думаеш, што калі я зрэзаў тую прысаду, дык я вораг для савецкай уласьці? Яшчэ, мы, гэтага паглядзім!“ Андрэя, дык яго толькі крыху скрэбла сумленьне: „Драў я некалі лыкі, а цяпер давялося садзіць. І пасаджу!“

Андрэй вельмі быў рад, што ні адной ня зрэзаў прысады. Ад гэтага куды больш шчымела-б цяпер сэрца. Не без таго: — калі зьявіліся пні на прысадах — Андрэй у адзін вечар таксама хацеў паехаць. Ён думаў тады цэлы дзень. Але пад вечар пашоў сьнег і Андрэй вырашыў: „Паеду, нараблю сьлядоў. Нехта цэлую восень рэжа, а я за ўсё буду адказваць“.

І не паехаў. Цяпер, Андрэй, проста дзякаваў першаму сьнегу, што ён затрымаў яго. Нечага, на сэрцы чыстае сумленьне. „Толькі-ж вось, гэтыя лыкі... Можна-ж было лазы надраць, дык не!“

Зусім зьмерклася, калі Міхалка з Андрэем ехалі дадому. Конь ішоў павольным крокам. Лейцы аслаблі ў Андрэевых руках. Міхалка сядзеў на біле калёс. Абапёрся аб біла абедзьвюма рукамі, нагой упёрся ў лёсткі драбінкі, другую—падагнуў пад сябе. „Каб ня выкінуцца, калі дзе падскочыць кола на каляіне“.

Змрок вечара згусьцеў, як тое цеста. І скрозь асеньнюю густату вечара блішчэлі толькі адны аганькі. Здавалася здалёк, што гэтыя аганькі — шматлікія ліхтары на нейкай вялікай чыгуначнай станцыі.

Яны пад'яжджалі да свайго калгасу і маўчалі.

Конь спускаўся з гары ў лагчыну і хацеў бегчы. Андрэй напяў лейцы і нібы з кпінкаю, з дакорам, на каня:

— Ціш! Цішай! А то зноў пагубляеш Міхалкавы рэхвы!

Міхалка, як сядзеў на біле калёс, аж прыўзьняўся.

— Няма табе чаго выскаляцца!—праказаў голасам вялікай крыўды,—я табе, можа, не Лявонаў Стасік!

Андрэй такі ня даў каню разгону. Хамут налез на конскія вушы, а конь перабіраў дробным крокам, як на парадзе.

— Я і не выскаляюся...—праказаў бязуважна.—Я-ж кажу, што рэхвы слаба трымаюцца на колах.

Міхалка сеў на памост драбінкі. Яму хацелася заплакаць ад крыўды, як таму маладому дзіцяці. Ён сьцяў зубы і прамаўчаў цэлую хвіліну. Потым узьняўся — стаяў каленкамі на голым памосьце ды абуджаным голасам:

— Андрэй! Ведаеш што, Андрэй... Ну, я зрэзаў. Я, можа, і дарогу ўсім паказаў. Бо я перш-на-перш зрэзаў. Я зрабіў па-

чатак. Тую зрэзаў, што нехта драў з яе лыкі. Нейкі недавярак абадраў яе, а я думаў, што яна ўсё адно ссохне..

Па Андрэевым целе перабеглі халодныя дрыжыкі. Як трымаў лейцы,—смаргануў каня, нават крыкнуў на Міхалку:

— А хто ў цябе пытае?!

Конь ірвануўся, а Міхалка абхапіў рукамі белы калёс і нейкім надламаным голасам:

— Як,—гэта хто пытае? Я можа сам у сябе пытаю? Я яе зрэзаў і яна збуцьвела лежачы ў таку. Шашаль зьеў яе. А я сёньня садзіў гэтыя дубчыкі. Я ў цябе пытаю: калі гэтыя дубчыкі вырастуць?

Андрэй зьдзіўлена азірнуўся на Міхалку. Ён проста не хацеў чуць, слухаць таго, пра што думаў сам. Ён абвярнуўся тварам да Міхалкі, сустрэў яго твар ды:

— Ці не звар'яцеў ты? Я-ж кажу:—хто ў цябе пытае? Нашто табе леташні сьнег?

— Не, брат, ня леташні сьнег! Я не хачу, каб мяне мучыла сумленьне. Не адзін я рэзаў прысады, а я сёньня бачыў, што ты злуеш на мяне аднаго. Ты думаеш - я не чалавек, а той гад, якога мы ўчора клялі? А я нават скажу перад усімі калгасьнікамі. Пабажуся табе, што скажу! Паглядзіш!

І ён змоўк.

Яны пад'яжджалі да самага калгасу. Міхалкавы словы нават расчулілі Андрэя. Ён хацеў цяпер сказаць яму: „Ня ты першы вінават, а я. Мая была першая віна. Давай ня будзем успамінаць старых прысад, а будзем даглядаць за новымі".

Але ён не сказаў. І можа таму не сказаў, што конь рысьсю ўбег у вішнёвыя прысады калгаснай вуліцы. А можа таму, што выказаў Андрэй сваю думку і за сябе і за Міхалку. Гэта, бадай, праўда! Бо цяпер зусім лёгка стала на сэрцы, весела... Узьедуць яны зараз на калгасны двор, а Міхалка каго спаткае, першаму і скажа:

„Пасадзілі маладыя прысады, і няхай паспрабуе хто-небудзь крануць хаця пальцам! Хай паспрабуе..."

Яны абодва цяпер маўчалі і здаецца бачылі:

Вось ужо і вырасьлі маладыя ліпы і як прыемна маладому калгаснаму саду! У сад не залятае нават шолах ветру.

Летні, сонцам заліты дзень. Цьвітуць ліпы... Колькі, колькі вунь, на ліповым цьвеце пчол! Ліпы сьпяваюць тонкаструннай музыкай. Кожны ліповы цьвецік прымае дарагіх гасьцей, частуе іх, усьміхаецца сонцу! З маладых ліп, з сочных, капае перасьпелае, асыпанае сонцам жыцьцё.

Сярод ліп—цьвіце вясна.

А цень ліповы—мяккі, ціхі... Гэта цень з-пад дзявочых расьніц! А потым вечар... Над маладымі ліпамі кружацца, наўзахапкі снуюць кросны майскія хрушчы. І зноў не змаўкае музыка ліп. Толькі яна цяпер была музыкай басэтлі, мяккай як плюш...

Сакавік, 1935 г.

УЛ. ДУБОЎКА*)

ПАЧЫНАЕЦЦА З ПАД ХМАР ВАНДРОЎНЫХ

Пачынаецца з пад хмар вандроўных,
пачынаецца з лясоў шумлівых.
Захадзіла сонца ціха — роўна,
а на захадзе чырвань нехта выліў.

І замоўклі дразды над балотам,
і у лесе сівакракі замоўклі.
Ноч пацягнула бяліць палотны,
Разьвіваючы непразрыстыя столкі.

Паляцелі вятры над далінай,
вышывалі расою сьцяжынкі...
Выхадзілі істужкай цьвятлівай
маладзіцы й дзяўчаты з дажынкаў...

Ад цямна і да цёмнага ў полі
за сярпом яны беглі гарбатым.
Дык таму ў паясьніцы ім коліць
і пякельна смыляць іх пяты.

Кажуць словы — жыта яны жалі,
а пяецца іншае ў песьні:
Пабіралі па загонах сьлёзы жалю,
вырасьлі што сёлета ў Палесьсі.

Песьня імчыцца, а жыцьця ня хваліць,
песьня стогне з пошчакам балюча.
Гэта Прыпяці стромкія хвалі
скаржацца аж да пяскоў зыбучых.

Сум вялікі, ой! узрос бязконца,
дзе-ж і лета, дзе і месяц ліпень?
Вусны пашчапаліся ад сонца
і да плеч кашулі зрэбныя прыліплі.

---

*) Уладзімер Дубоўка належыць да групы маладых поэтаў Усходняе Беларусі, якіх жорстка прасьледавалі бальшавіцкія ўлады за беларускі характар іх творчасьці. Ад некулькі год поэта нічога ня друкуе, ня маем ніякіх вестак, што з ім сталася наагул. Ягоная творчасьць, якая мае глыбокі індывідуальны характар, вызначаецца даволі цікавымі экспэрымэнтамі ў кірунку арыгінальнай, сучаснай хвормы. Паходзіць ён з сялянскай сям'і ў Вялейскім павеце. Першы зборнік сваіх вершаў п. н. „Строма" выдаў у Вільні ў 1923 г.; наступныя зборнікі: „Трысьцё" 1925, „Credo" 1926, „Там дзе кіпарысы" 1925 (поэма) друкаваў у Менску.

Першы верж і перадапошні перадрукоўваем із зборніку „Трысьцё", а другі і апошні — із зб. „Credo". Рэдакцыя.

Праляцелі вятры над далінай,
праляцелі вятры праз сасоньнік.
Серп гарбаты на хмары ускінуць,
хай ускінуць яны сягоньня.

Людзі скажуць, што гэта месяц,
што зубілі яго там, дзе зоры.
На яго з зямлі засьмяецца
Электрычная жнейка скора.

ПАЛЯЖАМ МЫ

Паляжам мы і вецер косьці нашы
паточыць, пылам над лясамі разьнясе.
Ужо сьціскае грудзі цяжкі кашаль
і вусны песень не нясуць красе.

Такі і лёс, такая перагаса:
маркотна мне і рады не дасі.
Задумаешся непакойна часам
і закалоцішся жыцьцём асін.

Чаму ня так, як сэрца хоча, просіць:
наадварот і супаратнасьць скрозь.
Пайду у сенажаці як на росы,
каб супакойна адпачыла скронь.

Іграй, іграй, каханы цымбалісты,
каб дні вясны маёй са струн зьляталі.
Ішлі яны пад вэлюмам імглістым
і гінулі ў жыцьці, як хвалі ў хвалях.

Не шкадаваў, не скардзіўся нікому —
хоць часам дух зьвіваўся ў немы лямант.
І сьвет увесь, нязнаны і знаёмы,
мне выдаваўся нейкай чорнай плямай.

Іграй, іграй, каб струны галасілі
і захліпаліся, як я сягоньня.
Загіну з гукамі ў тумане сінім
а ня схілю ні галавы, ні скроні.

Аддам усё за гукі шчырай песьні,
пакіну гукі ў новым барваваньні.
Ад Віленскіх вазёр да сумнага Палесься
я разьлію душу і згіну у нірване.

Дык грай-жа, грай, каханы цымбалісты,
каб дні вясны маёй са струн зьляталі.
Ішлі яны пад вэлюмам імглістым
і сьцежкаю ішлі... краіна дарагая!..

МОЖАЦЕ ЛАЯЦЦА

Можаце лаяцца да сыці,
да сквілу,
можаце клікаць і ночы, і дні.
Вока маё ня міргне палахліва,
хоць і ёсьць, як і быў, адзін.

У прасьцягах празрыста-
нязнаных
думка імклівіць нясупынны лёт:
Сьвяткую дубэльты сваіх
выгнаньняў,
як зялёнае сьвята штогодзіць
народ.

Помню і помніць буду
да жвіру
словы і сьпевы, дзе слоў
ня было.
Сенажаць зорак маўклівых
турбавала на хвалях вясло.

Соўкала човен нямое
прадоньне,
месяц і сонца цьвятлівілі.
шлях
Дарагое і апрыкрае сягоньня,
будзеш і ты ляжаць далавах.

Заўтрашняе чую, істотай вітаю
Кленчу на дзіды, растайны пыл.
Вясна мая, жыцьцём маладая,
табе я ня здрадзіў, з табою быў.

НЯ МОЖА АБЫЙСЬЦІСЯ БЯЗ ЛІРЫКІ

І ціхазвонна і паволі восень
лісьцё наземіць, сьцеле у даліны.
Хвіліну вецер іх цярушыць, носіць,
пакуль зямлі на грудзі ня ускіне.

Няма жалобы, ня чуваць і скаргі:
тугу жыцьцё ў лісьці пазалаціла.
На Беларусі і ў пяскох Сахары
адна уцеха ім і роўная магіла.

А дні вясны маёй? Паволі так-жа
і ціхазвонна ў нябыцьцё зьнікаюць.
У памяці іх сьлед ня згіне — ляжа,
і цяжкі часам, ён, як дзікі камень.

А я! Благаслаўляю дні, што зьніклі,
вітаю дні наступнага ў трывозе.
Няўжо і вы, як гэны камень дзікі,
на шыю занізьзю мне ляжаце увосень?

З трывогай гэтай аб адным малюся:
каб дні жыцьця майго па вітай сьцежцы
вялі мяне да любай Беларусі,
дзе кожны з дрэва ліст мне сэрца цешыць.

СТ. СТАНКЕВІЧ

Беларускія філёмацкія вершы Яна Чачота

Агульна ведама, што ўсе філёмацкія поэты, а разам з імі і Адам Міцкевіч, з вялікай любоўю адносіліся да беларускага народу і яго творчасьці, чэрпаючы з яе вельмі многа матываў да сваей поэзіі, а так-жа ўводзячы да свайго літаратурнага языка мноства беларускіх асаблівасьцяў. Іхняя творчасьць, як паказываюць сьцíслыя навуковыя досьледы, у вялікай меры вырасла на беларускім народным падкладзе, творачы ў польскай романтычнай літаратуры самародную рэгіёнальную плынь. З пасярод поэтаў філёмацкіх ярка выдзяляецца постаць Чачота, каторы патрапіў найбліжэй зрадніцца з беларускай народнай творчасьцю і найбольш беспасярэдна перадаць яе ў сваей поэзіі; пішачы ў ладнай меры пабеларуску, належыць ён адначасна да польскай і беларускай літаратуры.

Ян Чачот быў пераважна дасюль знаны нашай літаратуры, як першы сыстэматычны зьбіральнік і выдавец беларускіх народных песьняў, і як аўтар дваццаці дзевяці беларускіх вершаў, напісаных пасьля павароту із ссылкі (г. зн. пасьля 1833 г.), а надрукаваных у ведамых яго зборніках *Piosnki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny* з 1844 і 1846 г. Гэтыя яго вершы, як і фольклёрыстычная праца, маюць вялікае значэньне ў дасьпяваньні беларускага літаратурнага адраджэньня і вызначаюць у ім Чачоту адно з найбольш выдатных месцаў.

Аднак значэньне Чачота, як аднаго з першых пачынальнікаў беларускай адраджэнскай літаратуры, выдасца нам без прыраўнаньня большым, калі ўявім сабе, што яшчэ шмат раней, бо ў дваццатых гадох мінулага стагодзьдзя, з вялікім пасьпехам пісаў ён некаторыя свае вершы пабеларуску і ў творах польскіх вельмі ахвотна выкарыстоўваў беларускія народныя матывы. Гэтыя творы былі да нядаўняга часу пераважна няведамыя. Чачот, дзякуючы сваей вялікай скромнасьці, рэдка спатыканай сярод поэтаў, беспрэтэнсыянальнасьці ў паглядах на сваю літаратурную прадукцыю, якая аднак артыстычным роўнем перавышшала іншых філёмацкіх поэтаў, пры жыцьці нічога не друкаваў з гэтага пэрыяду, а па сьмерці яго творы доўга спачывалі ў рукапісах, пераходзілі з рук у рукі, шмат з іх пагінула, а шмат яшчэ й сяньня старанныя дасьледчыкі выносяць на дзеннае сьвятло.

Гэтак між іншым проф. пазнанскага унівэрсытэту В. Клінгер натрапіў у 1922 г. у Лодзі на тры рукапісныя зборнікі няведамае поэзіі Чачота, якія зьмяшчаюць больш за дзьвесьце дробных вершаў з часаў філёмацкіх, з пасярод іх каля 170

песьняў, пераважна эротычных, прысьвечаных дачцэ рэктара віленскага унівэрсытэту Зосі Малеўскай*). Гэтыя песьні ў ладнай меры зьяўляюцца пераробкамі або стылізацыяй беларускіх народных песьняў; поэта вельмі часта да сваіх песьняў пазычаў мэлёдыю (г. зн. рытміку і разьмер верша) з беларускіх народных песьняў, зазначаючы аб гэтым у адносьніках. Дзеля прыкладу зьвернем увагу толькі на некаторыя песьні. Прыкладам, песьня Чачота *Młodości luba czemuż tak marnie* укладзена поэтам на мэлёдыю папулярнай народнай песьні „Oj wałyž maje, dy paławyje“; патрыётычная песьня *O ty, ziemio nieszczęśliwa* мае адносьнік: „nóta—Paniczyku, karoliku—puskaj-ža nas da domeńku—žeńcy w Nowogródzkiem śpiewają“; урэшце адна з найпрыгажэйшых песьняў Чачота *Przez me podwórze Cieciera leciała* напісана на ўзор народнае песьні „Da cieraz moj dwor lacieła Ciaciera“, якую між іншым любіў сьпяваць у свае дзяцюцкія годы Адам Міцкевіч. Такіх песьняў Чачота, стылізаваных на ўзор ведамых яму беларускіх народных песьняў, спатыкаем у менаваных рукапісных зборніках каля дваццаці.

Ідучы за тагачасным романтычным кірункам, прабаваў Чачот шукаць свайго таленту і ў галіне баляды. Напісаў іх восем: *Bekiesz, Zamek Nowogródzki, Szczupak Kołdyczewski, Górka dzwoniąca w Puzieniewiczach, Radziwiłł—czyli założenie Wilna, Uznohy, Myszanka* і *Świteź*. Рукапісы гэтых балядаў загінулі і аб іх ведаем усяго толькі із справаздачы Я. Г. Рыхтэра (*Jan Czeczot i jego nieznane poezje*. Ognisko domowe, 1887), у якой знаходзім дакладны зьмест і цікавейшыя адрыўкі кожнае баляды. Гэтыя баляды, як могуць так-жа сьведчыць іх назовы, зьяўляюцца аснаванымі на беларускіх народных легендах, зьвязаных з канкрэтнымі мясцовасьцямі, пры гэтым іх народныя сюжэты адзначаюцца вялікай сьвежасьцю і фольклёрыстычнай праўдзівасьцю, што зусім ня відаць пасярэдніцтва поэты.

Як бачым, кірунак поэтыцкае творчасьці Чачота ярка вызначыўся ўжо ў яго раньняй моладасьці, калі, будучы арганічна зьвязаным з беларускай зямлёй і яе жыхарамі і культывуючы сьвядома й консэквэнтна гэтую лучнасьць у сваей псыхіцы, зьвярнуўся па поэтыцкі матар'ял перадусім да беларускай народнай творчасьці. Беларускі кірунак творчасьці Чачота найвыразьней праявіўся ў яго філёмацкіх вершах, пісаных пабеларуску. Гэтыя вершы, як і ўся поэзія філёматаў наагул, былі доўгі час няведамыя. Толькі ў 1922 г. надрукаваў іх Ян Чубак у зборніку, выданым Кракаўскай Акадэміяй Навук, п. н. *Poezje Filomatów*.

Першым філёмацкім творам Чачота, напісаным у беларускай мове, ёсьць верш на імяніны Старшыні Таварыства Філёматаў Язэпа Ежоўскага, сьвяткаваныя 19 сакавіка 1819 г. У вершы,

*) Аўтографы гэтых зборнікаў знаходзяцца сяньня ў маладога польскага поэты Сьвятаполка Карпінскага, а іх філёлёгічная копія, зробленая проф. Клінгерам, з якой і я карыстаўся, — у бібліятэцы Полёністычнага Сэмінара Віленскага Унівэрсытэту.

напісаным у хворме дыялёгу, выступаюць беларускія сяляне, прамаўляючы сваім уласным языком, — як цівун, войт, дзесятнік, хор хлапцоў, хор дзяўчат і сьпеў Мікіты. Патрапіў тут поэта з вялікай умеласьцю ухапіць народны тон. Рэалізм і прасьціня жыцьця сялянскага захаваныя тут поўнасьцю, сяляне захоўваюцца і прамаўляюць так, як у сябе дома. І гэты „цівун з двара“, што прыходзіцъ на чале сялян, і „сельскі дзесятнік“, што „лысіну гладзіць“, і войт, „што уса круціць, чалавек бывалы“, а так-жа экс-жаўнер і вясковы музыка — гэта людзі, узятыя жыўцом з народнага асяродзьдзя. Найпрыгажэйшымі адрыўкамі твору ёсьць песьні, якія сьпявае хор хлапцоў і дзяўчат. Не народныя гэта песьні, бо поэта мусіў іх прыстасаваць да тварыскае ўрачыстасьці, але іх хворма мае многа супольнага з беларускімі песьнямі народнымі. Характар народнае песьні асабліва надае ім умелае ўжываньне доўгіх, вобразных прыраўнаньняў, браных із сьвету вясковае прыроды. Напрыклад:

Lisiczka žouty hrybok,
Slimakou nie baicca;
Nie toczyć jaho czerwiaczok,
Jon u lesie zdarou bliszczycca.

Konik pa polu dureje,
Choć kopy wozić nia dbaje.
Saławiej charaszo pieje,
Samiczku k sabie sklikaje.

Budź, jak lisiczka, zdarowy,
Jak konik, wiesioł pry trudzie;
Niech Twajo pismo, razmowy
Jak saławja hołas budzie.

Такія прыраўнаньні зьяўляюцца тыповымі ў народнай песьні, якая звычайна пачынаецца ад якога небудзь абраза альбо зьявы ў прыродзе, пераходзячы потым да прыраўноўванага прадмету. Зусім зразумела, што гэтая песьня найбольш спадабалася філёматам; будуць яе сьпяваць падчас розных сваіх абходаў, а І. Дамэйка прыпомніць яе нават па підзісяці гадох *).

Наступная песьня, якую сьпявае хор хлапцоў, зьмяшчае ў сабе таксама характэрныя звароты, будучыя ўмелым стылізаваньнем народнае песьні:

Kolki ŭ snopie jeść ziernietek,
Tolko žyj szczaśliwych letek;
— — — — — — — — — — — —
Kolko za adnym pakosom
Kasiec dobry trau schędožyć,
Tolko Tabie piered nosom
Boh niechaj czerwońcou złožyć.

*) Ign. Domejko, Filareci i Filomaci, у кнізе H. Mościckiego, Z filareckiego świata. Варшава, 1924, 87. A. E. Odyniec, Domejko w domu rodzinnym (Kłosy 1884, II, Nr. 99). Korespondencja Filomatów, I, 142, 297 i 281.

A jak my zausze da lesa
Ad niekrutou uciekajem,
Tak niechaj bieda da biesa
Uciecze, niech jej nie znajem.

Зацемка ў апошняй зваротцы дакладна ілюструе тагачаснае палажэньне беларускае вёскі, калі ўцяканьне ў лес перад „некрутамі“ было штодзенным зьявішчам.

Падобных месцаў, маючых выразна народны характар, знойдзем у першым беларускім творы Чачота мноства, але і гэтых хопіць дзеля паказаньня яго сувязі з народнай творчасьцю.

Некалькі слоў трэба пасьвяціць мове верша, будучага першай пробай Чачота пісаць пабеларуску. Трэба прызнаць, што проба ўдалася, бо мова беларускага сялянства ўхоплена тут досыць трапна. Хаця ня было яшчэ ўсталенага правапісу і граматыкі беларускай, паэта патрапіў, зразумела з выняткамі, верна перадаць фонэтычныя і морфолёгічныя асаблівасьці гэтае мовы. Гэта сьведчыць, што ўжо тады прысвоіў ён даволі добра беларускую мову, над якой шырэй задзержыцца ў уступе да аднаго із зборнікаў *Piosnek wieśniaczych* і падасьць праект яе граматыкі. Імкненьне да рэалізму і праўдзівасьці ў прадстаўленьні народнае сфэры выразна адбілася і на языку. Такія часткі твору, як хор дзяўчат, хор хлапцоў і песьня Мікіты, напісаныя чыстай беларускай мовай, тыповай для Наваградчыны, адкуль паэта паходзіў, затое прамова Дзесятніка, які ў сувязі з сваім становішчам мусіў мець кантакт з дваром, пераплятае Чачот польскімі выражэньнямі.

Вялікім пасьпехам цешылася беларуская песьня Чачота *Da pakińcież horła drać*, напісаная на імяніны Дыянізага Хлявінскага, якую потым поэта перарабіў і прыстасаваў да імянінаў Фр. Малеўскага, сьвяткаваных 1 лістапада 1819 г. Чачот, паведамляючы Міцкевіча аб таварыскай урачыстасьці, піша: „Na imieniny Djoniza ułożyłem kilka chłopskich piosenek, między któremi ostatnia „Da pakińcież horła drać“ najlepiej przypadła Tomaszowi (Зану) do smaku; wykoncypował, jak wiesz, nutę i z tą się wszędzie, jak Cygan na jarmarku, popisuje. A że się podoba, musiałem tyle wierszy i dla Jarosza (гэтак празывалі філёматы Фр. Малеўскага) i od tegoż samego wiersza *Da pakińcież* poczynając, do niej wysztukować“ *). Што тычыцца гэтых іншых „kilka chłopskich piosenek“, якія напісаў Чачот, нічога ня ведаем, бо ў філёмацкім архіве не захавалася апісаньне імянінаў Хлявінскага. Крыху сьвятла кідае на гэтую справу карэспандэнцыя Чачотавых сябраў. Т. Зан у лісьце да Міцкевіча з 1 сьнежня 1819 г. успамінае, што „Jarosz oskarżył Tomasza, że śpiewa, a mianowicie sławną oną *Lisiczka żouty* etc. i sławniejszą co do muzyki ową *A jak przydzie kalada*, etc., do Dyoniza zrobioną, musiał śpiewać“ **). Таксама: Малеўскі інфармуе аб гэтай песьні

*) Koresp. Fil., I, 275; II, 415.
**) Ibidem, I, 281.

Міцкевіча, называючы яе „pieśnią faworytną“, каторая „milej się słucha, nižby się słuchało *God sawe the King*“ *). Хоць аўтара песьні ніхто не падае, найбольш аднак праўдападобна, што ёсьць гэта песьня Чачота, напісаная, як успамінае Зан у сваім лісьце, на імяніны Дыянізага Хлявінскага, якая, нажаль, загінула. Таксама ня ведаем пачаткавага тэксту песьні „Da pakińcież horła drać“, напісанай для Дыянізага, а маем толькі тэкст пазьнейшы, перароблены для Фр. Малеўскага. Што тэкст пачаткавы мусіў быць іншы, аб гэтым сьведчыць доўгі адрывак у захаваным тэксьце, у якім поэта зычыць Малеўскаму, каб ён хутка закахаўся і ажаніўся. Да Д. Хлявінскага, які прыгатаўляўся да духоўнага стану, Чачот такім спосабам прамаўляць ня мог.

Гэты невялічкі вершык Чачота, як і першы яго беларускі твор, дзякуючы свайму рэалізму і простым, штодзенным выражэньням, зьбліжаецца да народнае песьні. Апрача гэтага знаходзім тут цікавы народны звычай:

Da daj krasnu dziewaczku,
Kab jon z serca pakachau,
Da z harełkoj plaszeczku,
Swat ad niaho k niej jechau.
Hajda, hajda, hajda, hajda.
Da jechau, da to skazau,
Da nasz Hieranim, nasz byk
K waszej ciałuszcy prywyk.
Daj Boh jeje pojmaci,
Da da byczka zahnaci...

Ёсьць гэта адна з многіх народных формулаў, ужываных падчас абраду сватаньня. Калі бацькі маладой просяць свата сесьці за сталом, ён, паведамляючы аб прычыне свайго зьяўленьня, звычайна гаворыць:

Дзякаваць! Сядзелі на гэтай нядзелі!
Ды што з таго будзе? Наш бык
Ды к вашай цялушцы прывык!
Каб даў Бог таго нам даждаці
Каб вашу цялушку да нашага быка загнаці **).

Апошнім захаваным беларускім творам Чачота з часоў філёмацкіх ёсьць верш на прыезд Адама Міцкевіча, які зачынаецца ад слоў *„Jedziesz, mileńki Adam“*. Быў ён дэклямаваны на імянінах А. Міцкевіча і Т. Зана, сьвяткаваных супольна 24 сьнежня 1819 г. Вызначаецца ён тымі самымі асаблівасьцямі, што і іншыя беларускія вершы Чачота, г. зн. мае многа рэалізму і сьвежасьці дзякуючы зьбліжэньню да народнае песьні, якая пакінула асабліва выразны сьлед на другой яго частцы:

Nie tak nam sonka jasno
Bliszczyć, jak ciebie niet.
Radaści iszczem naprasno;
Uwieś nam niemił świet.

---

*) Koresp. Fil.: I, 302.
**) І. Носовичъ, Белорусскія песни, 134.

Saławiej nie tak nam pieja,
Rožy nie pachnie ćwiet,
Nie tak nam bieła laleja,
Kali ciabie tut niet.

Bez ciebie usio tut smutno,
Pa tabie płacze haj,
I reczki pływuć mutno,
U žałobie uwieś kraj.

Вось-жа і ў народнай песьні ў падобны спосаб выражае народ свой сум. З тугою закаханых альбо з нешчасьлівым лёсам замужняе жанчыны звычайна гармонізуе прырода, набіраючы адпаведны учуцьцёвы адценак.

І яшчэ аб аднэй беларускай песьні Чачота трэба тут успомніць, якой, сьпяваючы ў цэлі Т. Зана падчас сьледзтва філёматаў, разбудзіў імпровізатарскі талент Міцкевіча. Гэтая песьня, як і многія творы Чачота, загінула; ведаем аб ёй толькі із справаздачы О. Сьлізьня*) і А. Э. Адынца**), навочных сьведкаў. Апошні запамятаваў два яе вершы: „Było nas kilkunastu wieczorem w celi Tomasza Zana, gdzie też przyszli Suzin i Czeczot. Ten ostatni zanucił przy gitarze świeżo ułożoną przez siebie piosenkę w ludowym djalekcie rusińskim (białoruskim), której dwa tylko wiersze pamiętam:

Da latuć, latuć, da dzikije husi,
Da nas pawiazuć do dalokoj Rusi.

Treść dalsza wyrażała sprzeczne uczucia tych lecących dobrowolnie na południe, i tych wiezionych na północ z nadzieją i bez nadziei powrotu, i tak wszystkich wzruszyła do głębi, że płacz ogólny stał się wtórem pieśni, a śpiewak przedmiotem uścisków ***). Зацытованыя Адынцам два радкі песьні Чачота маглі быць мадыфікацыяй першага радка шырока ведамай народнай песьні:

Да ляцелі серыя гусі із Русі ****).

Вершы Чачота, пра якія была тут мова, ня могуць раўняцца з яго беларускімі вершамі пазьнейшымі, якімі хацеў беспасярэдна прамовіць да сялянства і гэтым самым практычна прызнаваў патрэбу беларускае нацыянальнае літаратуры. У часы філёмацкія поэта напэўна не адчуваў яшчэ гэтае патрэбы, хаця чуўся арганічна зьвязаным з беларушчынай і народную беларускую творчасьць прызнаваў адным з найгалаўнейшых пунктаў свае поэтыцкае праграмы. Аднак-жа і гэтыя вершы Чачота могуць мець некаторае значэньне для беларускае адраджэнскае літаратуры, як адныя з першых яе памятнікаў.

---

*) Otto Ślizień, Z Pamiętnika (1821—1824), у кніжцы H. Mościckiego Z Filareckiego świata, 140.

**) J. Tretiak, Młodość Mickiewicza. Petersburg, 1898, II, 287 і А. E. Odyniec, Wspomnienia z przeszłości, Warszawa, 1884, 285.

***) А. Odyniec, l. c., 285.

****) І. Носовичъ, l. c., 210.

В. ГАДЛЕЎСКІ

Стагодзьдзе новага беларускага друку

(Да 100-тых угодкаў выхаду ў сьвет беларускай катахізмоўкі)

Сёлета мінае 100 гадоў ад надрукаваньня беларускай катахізмоўкі, якая зьяўляецца пачаткам новага беларускага друку і дзеля гэтага выхад яе ў сьвет становіць, можна сказаць, эпоху ў беларускім культурным жыцьці.

Стары беларускі друк, які пачаўся 6 жніўня (ст. стылю) 1517 году надрукаваньнем Ф. Скарынай у Празе Чэскай „Псалтыра“ і які ў тым-жа 16 і часткова 17 стагодзьдзі дайшоў да найбольшага свайго росквіту, у 18 стагодзьдзі заняпаў зусім. Многа прычынаў злажылася на гэты заняпад. Галоўнай прычынай было тое, што наша тагачасная інтэлігенцыя раздвоілася: адна часьць пачала пераймаць польшчыну, а другая — царкоўна-славяншчыну. Першая частка ўводзіла ў беларускую літаратуру столькі слоў, хвормаў і зваротаў польскіх, што тагачасныя беларускія друкі, пачынаючы ад 17 стагодзьдзя, маюць характар нейкай моўнай трасянкі, зложанай з беларускіх і польскіх слоў. Гэтакай трасянкай пісалі тыя, што пераймалі каталіцтва і разам з ім польшчыну; яны з часам перайшлі цалкам на польскую мову. Тыя-ж, што аставаліся пры праваслаўі, таксама кідалі беларушчыну, варочаючыся да царкоўна-славяншчыны, або лепш кажучы—да стара-баўгаршчыны, якою былі пісаны царкоўныя кнігі. Павадыры праваслаўя ў нашым краі жадалі гэтым прыбліжыць жывую беларускую мову да „любезнѣйшого“ (як яны выражаліся) і „суптельнѣйшого языка словенского“. Жаданьне гэтае выплыла ў іх з зусім фальшывых асноваў, што быццам калісь усе славянскія плямёны мелі тую славянскую мову, якая перахавалася несапсаваная ў царкоўных літургічных кнігах. Дзеля гэтага павадыры праваслаўя ў нас стараліся ўдзяржаць гэту мову ўва ўсіх ня толькі царкоўных, але і сьвецкіх кнігах, каб такім спосабам захаваць еднасьць славянскіх плямёнаў ад Адрыятыкі да Ноўгараду*). У імя гэтай еднасьці вучыцялі забаранялі вучням брацкіх і наагул царкоўна-рэлігійных школ гаварыць мовай народнай („простай“), а загадывалі ўжываць мову славянскую або грэцкую**). Ясна, што мова, якая ня мела апорышча ў народных масах, інакш кажучы, якая **ня жыла**, не магла ўдзяржацца на ўзьверху жыцьця і мусіла заняпасьці; а з заняпадам мовы заняпаў і стары беларускі друк.

Адраджэньне новай літаратуры і разам з ёю беларускага друку пачалося ў першых гадох 19 стагодзьдзя. Прычыніліся да

*) Hl. W. Łastoŭski. Historyja Biełaruskaj (Kryŭskaj) knihi. 1926 h. str. 497—8.

**) Голубевъ. Исторія Кіевской Академіи. т. I, стр. 198.

гэтага новыя, часта рэвалюцыйныя ідэі, якія прыходзілі да нас з Заходу ў часы напалеонаўскіх войнаў, а так-жа і пазьней, — і рабілі некаторыя зьмены ў паглядах і настроях грамадзянства, а асабліва моладзі, якая гуртавалася тады каля Віленскага Унівэрсытэту (1803—1832 г.г.). Шмат прычыніўся да адраджэньня нашай літаратуры і друку кірунак званы романтызмам, які разбудзіў любоў да народу і народнай творчасьці. Пад уплывам романтызму трацяць сваю сілу даўнейшыя пагляды на псэўдаклясычную літаратуру, якая не прызнавала „простых“ хвормаў і „простых“ моваў, але прабуджаецца ў грамадзянстве зацікаўленасьць мінуўшчыняй свайго краю і народу і разьвіваюцца краёвыя імкненьні.

У гэтым-жа часе паўстаюць на Ўсходзе Беларусі першыя творы новай беларускай літаратуры, як „Энэіда на выварат“, напісаная ў пачатку 19 ст. па прыкладу такога-ж твору ў украінскай мове — „Энэіды“ Катлярэўскага, паўстаюць у тым часе і першыя творы Яна Баршчэўскага—паэма „Рабункі мужыкоў“, верш „А чым-жа твая, дзеванька, галоўка занята“ і іншыя. Гэты апошні верш, хоць зьяўляецца адным з першых твораў новай беларускай літаратуры (напісаны быў у 1809 г.), то аднак друкаваны быў у 1843 г. Таксама пазьней траплялі ў друк іншыя тагачасныя творы, як „Энэіда навыварат“, а паэма „Рабункі мужыкоў“ дайшла да нас толькі ў невялічкай частцы, запісаная ад народу ў неаднолькавых рэдакцыях і надрукаваная шмат пазьней у розных кніжках. Значыць, уся тагачасная беларуская літаратура чыталася ў рукапісах, а ў друку не паяўлялася.

Першай беларускай кніжыцай, якая выйшла з друкарні і зрабіла пачатак новага беларускага друку, ёсьць, як мы ўжо ўспаміналі, беларуская катахізмоўка з 1835 году. Дзеля гэтага яна становіць новую эру ў гісторыі беларускага друку.

„Летапіс Беларускага Друку“ (Менск, 1929 г.) пачынае свае бібліяграфічныя весткі аб новым беларускім друку ад даты выхаду гэтай кніжыцы, г. зн. ад **1835 году** *).

Пярэйдзем цяпер да разгляду самай кніжыцы.

Фармат яе невялікі: 15×10 цм., бачын мае 24. На першай бачыне загаловак у мове польскай: „*Krótkie zebranie nauki chrześcijańskiey dla wieśniaków mówiących językiem polsko-ruskim wyznania rzymsko-katolickiego*“. *Wilno, w drukarni dyecezalnej, 1835.*

На другой бачыне знаходзіцца духоўная апрабата такога зьместу: „Roku 1835. dnia 5 Czerwca w Wilnie. Ten krótki Katechizm, zawiera w sobie naukę zdrową i dla prostaczków pożyteczną. Biskup Rządzący Dyecezyą Wileńską Orderów Kawaler

*) „Летапіс Беларускага Друку“ пачаў выходзіць у Менску ад 1925 г. (цяпер „Летапіс Друку БССР“). Першы сшыток, які меў абыймаць старадаўныя беларускія друкі, дагэтуль ня выйшаў, другі сшыток (з 1929 г.) абыймае новыя бел. друкі ад 1835 да 1916 году, трэці—ад 1917 да 1924, чацьвёрты падае бел. пэрыядычны друк ад „Мужыцкай Праўды“ (1863 г.) да 1926 г. уключна.

Jędrzej Benedykt Kłągiewicz". Пад гэтым зараз маем яшчэ і дазвол расейскай цэнзуры: „Pozwolono drukować. Wilno 12. Czerwca 1835. roku. *Cenzor P. Kukolnik**). Зьмест кніжыцы такі: на бачынах 3—15 зьмешчаны каталіцкія катахізмы ў беларускэй мове; на бачынах 15—18 пацеры — папольску; на бачынах 19—24 малітвы (акты веры, надзеі і любові, ахвяраваньне сьв. Імшы і песьня: О мой Божа, веру табе) ізноў пабеларуску.

Загаловак кніжыцы, як мы ўжо бачылі, трохі задаўгі і ў сваім зьмесьце для сучасных можа нават незразумелы. Перадусім кідаецца ў вочы, што пададзены ён у мове польскай, а прыгэтым нашу мову называе „językiem polsko-ruskim". Чаму так сталася? Адказаць на гэтае пытаньне, ня маючы адносных з таго часу дакумантаў, даволі трудна. „Chryścijanskaja Dumka" (№ 9 г.г.), пішучы ў гэтай справе, кажа, што назваць уласным імем беларускую мову ў выдаўца (аўтара) або ня было адвагі, або ня было належнага зразуменьня, пры гэтым „Chr. D." робіць заўвагу, што яшчэ і сягоньня многія палякі як украінскую мову, так і беларускую любяць называць рускаю". Здогад „Chr. D." нам выдаецца трапны, але на наш пагляд трэба тут дапусьціць яшчэ адну гіпатэзу, а іменна, што тады ня было яшчэ агульна-прынятага назову адносна нашай мовы. Бо калі некаторыя тагачасныя пісьменьнікі (Баршчэўскі, Рыпінскі) выразна завуць яе беларускай, то іншыя (напр. Чачот) называе яе „крывіцкай"**). Аўтар катахізмоўкі, дзеля няведамых прычын, назваў яе „польска-рускай". Але справа не ў назове, а ў характары самой мовы, а мова гэта, трэба прызнаць, чыстая беларуская. Здараюцца аднак словы польскія, якіх аўтар, відаць, ня мог ці не хацеў заступіць беларускімі, напр. nayświętszy, poświęcenia; ёсьць крыху і расейскіх, напр. прасьціж, Істынному, тот, прінімалі; ёсьць і формы расейскія, напр. стыдзясь, бажась; але наагул бяручы, як мы ўжо казалі, мова ў катахізмоўцы чыстая беларуская. Возьмем для прыкладаў пару мясцоў:

Jak nas adkupiu Syn Božy? Astauszy się czaławiekam sam siebie addau na ciažkie muki i na kryžu umior cierpiuczy i pakutujuczy za naszyie hrechi. Hdzie ciapier iość Syn Božy? U Niebie na praway ruce Boha Atca i u Najświętszym Sakramencie, to jest, u naszey Kamunij...

Czyž takim sposabam jość Pan Jezus u nayświętszym Sakramencie, jak u niebie pa praway ruce Boskiey? Nie ni takim sposobam, bo ŭ nayświętszym Sakramencie ukryty, a u Niebie nie ukryty. A czy jość u światoy Kamunii chleb? Nie, nietuci, ni troszki chleba, no tolki znak chleba biełašć, kruhłašć i smak...

Szto jość hrech? Hrech jest dabrawolnoje prestuplenie prykazania Božaho albo cerkownaho...

Wieru szto Boh jość adzin u Troycy Światoy Boh Aciec, Boh

*) Знакі прыпынку, правапіс і курсыў так як на арыгінале.
**) Гл. Piosnki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny. Wilno. 1846.

Syn, Boh Duch Światy—try asoby adzin Boh. Wieru szto Pan Boh jość sprawiedliwy dobrym dajeć Nieba, a złych wiecznym piekłam karaić. Wieru szto Syn Božy druhaja asoba Troycy Światoy Jezus Chrystus dla naszaho zbawienia naradziusia z Maryi Dziewicy i umuczany umior na kryžu, wieru szto u Prenayświętszym Sakramencie jość praudziwaje cieła i krou Jezusa Chrystusa, žywy Chrystus i praudziwy Boh. Wieru szto dusza ludzkaja jość nieśmiertelnaja. Wieru nakaniec usio toja, szto wieryć i uczyć cerkwa świataja Katalickaja Rymskaja i u etay wiery Bože moy chaczu žyć i umierać bo to ty Bože nieamylny tak abjaviu i wieryć prykazau. .*)

З гэтых прыкладаў відаць, што мова беларуская мае побач з славамі польскімі і расейскімі, словы ўсходніх (віцебскіх і магілёўскіх) беларускіх гаворак („нетуці"), так што трэба дагадвацца, што і аўтар гэтай катахізмоўкі быў родам адтуль. Дзеля таго, што сам біскуп Клонгевіч быў родам з Віцебшчыны, насоўваецца думка, ці ня ён сам быў аўтарам гэтай катахізмоўкі? А калі ня ён, то пэўне нехта з яго прыбліжаных. Але гэта можна было-б сьцьвердзіць толькі на падставе дакумантаў, якіх, нажаль, дастаць цяпер ня было магчымасьці.

(Аўтар гэтых радкоў, хочучы дасьледзіць прычыны і грунт, на якім паўстала гэтая катахізмоўка, а так-жа, хто быў аўтарам яе, хто выдаўцом, хто цэнзарам, пры якіх варунках і абставінах была дадзена духоўная апрабата, ці паміж выданьнем гэтай катахізмоўкі і пачаткам тагачаснага беларускага пісьменьніцтва была якая сувязь, — з гэтай мэтай адведаў Віленскую Арцыбіскупскую Курыю, просячы дазволу пераглядзець адносныя архіўныя дакуманты, але ў Курыі яму заявілі, што такіх дакумантаў няма, бо перад нямецкай акупацыяй яны былі вывезены ў Расею і дагэтуль ня вернены, як спорныя паміж Польшчай і Літвой. Дык асталося адлажыць досьледы над усімі нявыясьненымі пытаньнямі да лепшых часаў).

Катахізмоўка гэта—цяпер бібліяграфічная рэдкасьць. У Вільні, наскольні ведама, ёсьць два экзэмпляры: адзін у зборах „Беларускага Каталіцкага Выдавецтва", падараваны туды некалькі гадоў таму кс. Ул. Талочкам, а другі — у беларускім Музэі ім. І. Луцкевіча. Першы экзэмпляр дайшоў да нашых рук дзякуючы кс. Язэпу Авіжонісу, як аб гэтым сьведчыць надпіс, зроблены алаўком на самай катахізмоўцы: Ex libris sacerdotis Josephi Avižonis **). Адзін экзэмпляр, як падае „Летапіс Бел. Друку", знаходзіцца так-жа ў Бібліятэцы Ленінградзкага Унівэрсытэту.

Гэтулькі можна сказаць цяпер аб гэтай кніжыцы, якая пачала сабою новы друк. Спадзяёмся, што далейшыя досьледы выясьняць прычыны яе паўстаньня, яе аўтара, а так-жа той грунт, на якім яна ўзрасла.

---

*) Іншыя прыклады мовы ў гэтай катахізмоўцы гл. „Chr. Dumka" № 9 г. г.

**) З кніг ксяндза Язэпа Авіжоніса.

УЛ. ТАЛОЧКА

Да справы веравызнаньня Фр. Скарыны

(З нагоды працы кс. др. К. Кантака „Bernardyni Polscy“. Lwów 1933)

Асоба Фр. Скарыны з гістарычнай цемры выяўляецца прад намі штораз больш. Вось нядаўна кс. праф. др. Каміль Кантак (Пінск) у вышэй успомненай сваей двутамовай працы нямала кідае сьвятла на нявырашаную дагэтуль справу веравызнаньня гэтага беларускага дзеяча з XVI ст.

Аўтар гэты, гаворачы аб кляштары ў Полацку Бэрнардынаў і аб іх там дзейнасьці, між іншым выражаецца гэтак: ...„między nawróconymi znalazła się także rodzina Skorynów, jak o tem świadczy imię znakomitego wydawcy Franciszek“ (I, 179).

Гэтае цьверджаньне, ведама, апрача праверкі, вымагае такжа асьвятленьня варункаў і асяродка дзейнасьці Бэрнардынаў у Полацку.

Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Аляксандра адносна да каталіцтва праводзіў палітыку свайго бацькі Казімера Ягайлавіча; за яго часаў ордэн Бэрнардынаў або йнакш Францішканаў „antiquae observantiae“ прыбыў на Беларусь і хутка здабыў пашану ў манарха, а так-жа часткова й у беларускага насельніцтва. Вось-жа ў 1498 г. Бэрнардыны аселі ў Полацку і павялі працу ў кірунку наварачваньня Беларусаў праваслаўных на лацінскае каталіцтва. Не бяз прычыны маскоўскі цар Іван III ужо ў 1502 г. з абурэньнем выражаўся, што ў Полацку паўстала „Рымская бажніца“ (Daniłowicz J. — „Skarbiec dyplomatów“, II, Wilno 1862. Nr. 5119).

Кляштар Бэрнардынаў знаходзіўся ня ў самым Полацку, але за горадам, на прадмесьці Заполацьце, на захад ад даўнейшага княжага замку, недалёка ад утоку Полаты ў Дзьвіну. Месца гэта можна азначыць на найдаўнейшым пляне Полацку з 1579 г. (А. Сапуновъ — „Рѣка Западная Двина“. Витебскъ, 1893, 426—7). Кляштар, як і касьцёл пры ім, збудаваныя былі з дрэва і падчас войнаў у XVI ст. былі спалены, а пасьля адбудаваныя ўзноў. Касьцёл называўся „Ara Coeli — Брама Неба“.

Лік каталікоў лаціньнікаў ужо тады ў Полацку быў даволі значны. Нават адзін з каталікоў быў бурмістрам (Daniłowicz, 2104).

Рэлігійны і маральны ровень беларускага насельніцтва быў тады дужа нізкі. Многія ня былі нават хрышчаны. Аб рэлігійнай сьведамасьці агулам не магло быць і мовы. Вось-жа ніва для працы была шырокая й запушчаная і Бэрнардыны горача на ёй узяліся за працу. Яны многіх ахрысьцілі, а многіх навярнулі з праваслаўя на каталіцтва. Дзякуючы іх працы, каталікоў у Полацку пасьля некаторага часу налічалася некалькі тысячаў (Kantak, I, 179).

Запазнаўшыся з каталіцтвам праз Бэрнардынаў у Полацку ў маладых сваіх гадах, Скарына, відаць, прыняў каталіцтва і новае імя Францішак, культ якога ў каталікоў быў у Эўропе дужа вялікі.

З той-жа працы кс. Кантака даведваемся яшчэ, што полацкія Бэрнардыны „posługiwali się mową ruską", што, пэўне-ж, азначае мову беларускую. Ведама, з гэтага ня вынікае, што яны сталі ў касьцеле гаварыць пабеларуску навукі, хоць няма доказу, што й так ня было,—але карысталіся мовай беларускай часад-часу, як мовай успамагальнай. У кожным выпадку, як на канец XV і пач. XVI ст. і гэтага было многа. Вось-жа і гэты факт у працэсе зьмены сямьёй Скарынаў праваслаўя на каталіцтва мог мець сваё значэньне.

Можна спадзявацца, што далейшыя навуковыя досьледы над мінуўшчынай Полацка*) і над біографіяй слаўнага Францішка Скарыны, доктара з Полацка, дапамогуць аканчальна выясьніць, дагэтуль нявырашаную, справу яго веравызнаньня.

Справа-ж гэта мае важнае значэньне, як для выясьненьня эпохі, так і культурнай дзейнасьці Францішка Скарыны.

Было-б урэшце дужа пажадана, каб прадстаўнікі маладой беларускай навукі магчыма ў найхутчэйшым часе прыступілі да апрацаваньня й выданьня кнігі агулам аб Скарыне, аб якім сапраўды мала ведама, а часта й тое, што ведама—ня сусім пэўнае.

---

*) Сяньня над мінуўшчынай Полацка й Полаччыны працуе віленскі праф. Меніцкі. (Ул. Т.).

ДР. СТ. ГРЫНКЕВІЧ

З зацемак аб тэатры

Роля тэатру вельмі важная ў жыцьці чалавека і народаў. Ёсьць некаторыя, што кажуць, быццам само жыцьцё гэта бязконцы, значыцца ад пачатку існаваньня чалавека да ягонага канца, тэатр.

Ці правільна гэта ці не — спрачацца ня будзем, адцемлюючы толькі, што бязумоўна значэньне і роля тэатру вельмі важная і гэта выявілася ў надта далёкай ужо мінуўшчыне, калі ледзьледзь чалавек пачаў арганізаваць першую грамаду, калі сышлося некалькі чалавек, каб супольна бараніцца перад зьвяром ці перад благім чалавекам. Дык усюды, дзе ёсьць грамадзкае жыцьцё, усюды ёсьць і тэатр.

Незаўсёды завем тэатральнае запраўдным імем — значыцца тэатрам. Возьмем народныя абрады, возьмем хрэсьбіны, возьмем хаўтуры, успамянем задушкі, дзядоў, ці возьмем вясельныя, жніўныя ці іншыя абрады — усюды ў іх мы знойдзем магутныя доказы тэатральнага інстынкту паміж Беларусамі. Гэта ведама, свомасьць шмат шырэйшая і не абмяжоўваецца выключна Беларусамі і тэрыторыяю Беларусі. Аб тэатры чуем у надта далёкай мінуўшчыне, да сяньня яшчэ глядзельнікі захопліваюцца трагэдыямі старых Грэкаў, столькі ў іх зьместу багатага, агульна чалавецкага.

Тэатр—патрэба натуральная і вельмі важная ў жыцьці грамадаў людзей. Тэатр ня толькі мілая гульня, гэта магутны нахіл адзінкі ўявіць праўду, абычаі, спасьцярогі пры помачы канкрэтных абразоў. Бяз помачы гэных пачуцьцёў, якія выклікае тэатр, няпрывыкшаму да абстрактнага думаньня некаторыя паймы астаюцца чужымі, ён ня можа ўявіць сабе іх зусім.

Дзеля гэтага наглядаем ува ўсіх культах рэлігійных гэткі развой тэатральнасьці. Духоўнікі, людзі пакліканыя, каб некаторыя праўды паказываць, распаўсюджываць, былі прымушаныя дэманстраваць Найвышэйшую Істоту абразна, каб думаючы аб Ёй было лягчэй уявіць, каб гэная Істота была нечым, каб гэта ня быў толькі адзін парожні гук.

Адначасна тэатральнасьць мае іншыя жаролы ў чалавеку. Кожны чалавек мае свае думкі, настроі, кожны імкнецца па меры магчымасьці падзяліцца з імі са сваім асяродзішчам; выказываючы свае, яшчэ мо' ня зусім уяўленыя думкі, чалавек пачынае лепш бачыць іх у сабе. Толькі вось ня ўсенька можна выказаць словам. Іншым разам аж нешта сьціскае пад сэрцам, а ня ведаеш, што яно там сапраўды, нечага чалавек хоча, за нечым тужыць, аб нечым лятуціць. Гэта ведае кожны, адзін больш, другі менш, аднак гэта свомасьць надта характэрная

ў людзей. Маладыя маюць „настроі“ больш ярка падчыркнуты, у іншых да познага веку астаюцца яны вельмі моцнымі і жывымі.

Гэныя вось настроі ўяўляюцца найлепш у вершах, музыцы, скоках, адным словам у абразным прадстаўленьні. Ясна, хворма гэтага прадстаўленьня будзе розная, залежна ад роўня культуры, ад багацьця хвормаў, якімі карыстаецца і якімі валадае дадзенае згуртаваньне людзей. Аснаўны аднак характар астаецца ўсюды той самы, і настолькі нам накідаецца, што нават часта зусім нам далёкае і адлежнасьцю геаграфічнаю і ўмовамі жыцьця самога гаворыць да нас абразамі кожнаму блізкімі і зразумелымі.

Заўсёды, думаючы на гэту тэму, накідаецца мне на памяць абразок з жыцьця маляйскае вёскі. Некалькі гадоў таму назад адзін з нямецкіх цыркаў вандроўных (цырк між іншым сусьветнае славы „Hagenbecka“) вазіў з сабою горбу гэных, як мы кажам, „дзікуноў“, напалову апранутых, заўсёды зьмерзшых, ня гледзячы на гарачую летнюю пару. Гэныя людзі паміж розных сваіх штукаў паказвалі перад глядзельняю свае абычаі вясковыя ў хворме быццам карагодаў, песьняў супольных грамадзкіх. І калі-б заплюшчыць вочы, каб ня бачыць чужых твараў, ці каб прынамся апрануць гэных людзей у выабражэньні ў нашыя шэрыя сьвіткі, дык была-б абсалютная ілюзія беларускае вёскі, з яе сумнымі матывамі хаўтурнымі ці на‘т жніўнымі.

Дык тэатр гэта зьявішча незалежнае ад эканамічных мамэнтаў, незалежнае ад змаганьняў соцыяльных, незалежнае ад злыбядаў грамадзкіх і прыватных, гэта ў пэўным сэнсе зьявішча ўніверсальнае, прысутнае на кожным пункце кулі зямное. Кажу незалежнае зьявішча, маючы на ўвеце аснаўныя рысы тэатру, бо ў працягу вякоў тэатр апранае розныя хвормы, ён багацейшы ці бяднейшы, ён пакідае па сабе большыя ці меншыя сьледамкі ў сэнсе ўзгадаваньня, бо-ж тэатр узгадоўвае, што зразумець вельмі лёгка, гэта ўсенька залежна ад таго, якія агульныя канюктуры, якія магчымасьці грашовыя, якімі праблемамі жыве чалавецкая грамада і г. д.

Ёсьць пэрыяды заняпаду тэатру, хаця не прападае ён ніколі; ён патрэба душы, як хлеб патрэба цела. Побач з хлебам будуць рознаякія стравы, ад пары да пары тая ці іншая страва мо‘ вельмі смашная будзе на нашым стале, аднак да хлеба заўсёды мы вернемся.

Пэрыядам заняпаду тэатру, праяваў тэатральных, быццам на‘т інстынкту тэатральнасьці, былі нядаўнія ў нас гады, калі чужое ў нас духавенства, асабліва каталіцкае, у сваём змаганьні (што за парадокс!) з „брэднюшкамі“, як гэта яны казалі, пачалі выганяць з хатаў старыя абычаі, песьні, абрады.

Некаторыя сяньняшнія воласьці нашае заходняе тэрыторыі няшчасныя, зусім „глухія“ куткі, дзе сумна і мляўка пляцецца дзень рабочы, дзе народ пачынае быццам стогнучы дзень і канчае яго бяз ніякае радасьці. Яны ня маюць хвормы прыгожае дзеля сваіх перажываньняў, а ня маючы хвормы вонкавае, ня

маюць тае глыбіні, шчырасьці і тае простае радаснасьці гэтак карыснае дзеля агульнага ўздойму, бадзёрых адносінаў да жыцьцёвага току.

Тэатр, песьня, музыка — усенька стульна злучана з сабою і адно з аднаго выходзіць, дапаўняе адно адное і дае тое каліва шчасьця і радасьці, да якое гэтак пражна імкнецца жывая адзінка.

Гэтак разумеючы вялікае значэньне тэатру і іншых праяваў мастацкасьці ў жыцьці адзінкі й грамады, лёгка ўявім сабе, якія могуць быць нашыя адносіны да іх.

Кнігапіс

ПІСЬМЕННІК І МОВА. Зборнік артыкулаў, прысьвячаных барацьбе за культуру мовы. Выдавецтва Беларускай Акадэміі Навук, Менск 1934.

Загалавак гэтай кніжкі, праўда, дужа цікавы і панадны. Барацьба за культуру мовы—гэта справа для кожнага народу сапраўды важная, а для народу беларускага тым больш. Аднак, на жаль, загалавак кніжкі агулам шмат у чым рэзка расходзіцца з яе зьместам. Прачытаўшы артыкулы гэтай кніжкі, робіцца ясным, што фактычна не аб культуру мовы ёй расходзіцца, а сусім аб нешта іншае.

Кніжку „Пісьменнік і мова“ папераджае прадмова дырэктара Інстытуту Мовы ў Бел. Ак. Навук Андрэя Александровіча. Прадмова гэта надае тон бадай усей кніжцы, нядвузначна паказваючы, як камуністы разумеюць адносіны пісьменніка да мовы і што яны разумеюць пад славамі—„культура мовы“.

Вось-жа пад сьцягам „пролетарскага інтэрнацыяналізму — кажа А. Александровіч — павінна разгортвацца барацьба за культуру мовы“, пад якім „ушчэнт зломяцца рамкі нацыянальнае абмежаванасьці... Крытэрыяў якасьці нашай мовы мы павінны шукаць у работах клясыкаў марксізму: Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. У іх выказваннях аб мове асноўныя, выходныя прынцыпы для нашай барацьбы“...

З гэтага бачым, што барацьбы за культуру мовы і адносінаў да яе пісьменнікаў маюць вучыць нас асобы і іх творы, якія з прыгожым пісьменствам, як з узорам і сродкам культуры мовы, ня маюць нічога супольнага. Стопрацэнтныя палітыкі маюць быць узорам для адносінаў пісьменнікаў да мовы і для тварцоў культуры мовы! Словам, у аснову кніжкі „Пісьменнік і мова“ паложаны не падставы навукі, а сучаснай савецккй палітыкі, каб,

між іншым, „ушчэнт зламаць рамкі нацыянальнае абмежаванасьці“, гэта знача, як убачым далей, каб ня даць самастойна разьвівацца беларускай нацыі, а каб яе асыміляваць з нацыяй расейскай.

Першы ў кніжцы-зборніку артыкул „Аб мове“ М. Горкага. Ведамы гэты расейскі пролетарскі пісьменьнік у сваім гэтым артыкуле аддае, праўда, дань сучаснаму савецкаму палітычнаму рэжыму і падчырківае патрэбу, каб савецкі пісьменьнік карыстаўся такой мовай, якая прадусім была-б верным адбіцьцём бягучага, сучаснага, пролетарскага жыцьця Саветаў. Пераважную аднак увагу зварочвае ён на тое, каб пісьменьнік у адносінах сваіх да мовы сьцярогся такіх слоў і такіх зваротаў, якія зьяўляюцца звычайным сьмяцьцём, або проста хуліганскімі выражэньнямі. Маючы на мэце ўрэшце сапраўды культуру мовы, М. Горкі радзіць ня чурацца мінуўшчыні, а карыстаць нават з царкоўна-славянскай мовы і з твораў рэлігійных: „У старой славянскай мове—кажа ён — усё-такі ёсць важкія, дабротныя і вобразныя словы, але неабходна адрозьніваць мову царкоўнай дагматыкі і проповедзі ад мовы поэзіі. Мова, а таксама стыль лістоў пратапопа Аввакума і „Житія“ яго застаюцца нераўзойдзеным узорам палкай і страстнай прамовы байца, і наогул у старыннай літаратуры нашай ёсьць чаму навучыцца“.

Увагі такім чынам М. Горкага што да культуры мовы шмат у чым правільныя і цэнныя. Ня ўсе, на жаль, аўтары чародных артыкулаў зборніку пайшлі ягонымі сьлядамі. Адны з іх аказаліся малапанятлівымі ягонымі вучнямі, а другія проста перасталіся.

Так напр. наступны пасьля Горкага артыкул М. Клімковіча „Вырваць з корнем пустазельле“ – гэта звычайны агітатарскі выпад проціў беларускай культуры і мовы. Усё беларускае не бальшавіцкае — гэта ўсё шкоднае і ненавуковае. „Калі прагледаеш „работу“ нацдэмаў*) у галіне мовы, — піша Клімковіч — кідаецца ў вочы іх лжэнавуковасьць. І гэта зразумела. Навуковая работа ў галіне мовы павярнулася-б усім сваім астрыём супроць нацдэмаўскіх лжэвучоных, супроць цемшалу, які прапаведаваўся імі ў якасьці „навуковых“ ісьцін. Навуковае вывучэньне мовы разаблачыла-б шкоднасьць і штучнасьць аддзяленьня кітайскай сьцяной беларускай мовы ад рускай, даказаўшы і выпукліўшы тое агульнае, што маецца ў абодвых мовах, што іх яднае“... Гэткім больш менш „навукова“ выглядае і ўвесь М. Клімковіча артыкул. Усё ў нашай мове беларускае самастойнае, што яе, як мову самастойную, ярка адрозьнівае ад мовы расейскай, трэба выкінуць, а на месца ўсяго гэтага ўставіць русыцызмы—вось галоўная тэндэнцыя ўсяго „навуковага“ артыкулу Клімковіча.

Даволі прыемнай перадышкай, прачытаўшы артыкул М. Клімковіча, зьяўляецца артыкул Якуба Коласа—„Мова М. Лынькова

---

*) Беларусаў небальшавікоў, беларускіх нацыянальных дэмакратаў. Ад.Ст.

па раману „На чырвоных лядах". Праўда, і ён, падлягаючы „вучонаму" рэжыму ў Саветах, калеча беларускую мову на расейскі лад („па раману", замест „у рамане") і борыцца з „нацдэмізмам", але агулам піша дарэчы, навучальна і разумна: „На чарзе дня — кажа Я. Колас — і востра стаіць у нас пытаньне аб ачышчэнні літаратурнай мовы ад нацдэмізмаў. Але ў дачыненні да беларускай мовы ёсьць адна акалічнасьць, якая патрабуе ад нас і пэўнай засьцярожлівасьці. Трэба надзвычай пільна і востра сачыць, каб пад відам змагання за чыстату беларускай мовы не прылажыў свае рукі і клясавы вораг. Пад сьцягам змаганьня з нацдэмізмамі ён можа павесьці работу ў пляне дыскрэдытацыі, вынішчэння і абяскроўлення самой мовы". Вось-жа тут Я. Колас выразіў чыстую праўду. Сяньня ёсьць ведамым фактам, што ў БССР пад відам змаганьня за чыстату беларускай мовы сапраўды праводзіцца глумленьне беларускай мовы і асыміляваньне яе з мовай расейскай.

Далей Я. Колас робіць агляд мовы Лынькова ў успомненым рамане, выказваючы цэлы рад правінцыялізмаў, прыкладаў вульгарнага натуралізму, часам зblіжанага да порнографіі, манатонную аднастайнасьць у стылі, а так-жа крыху русыцызмаў.

Ад провінцыялізмаў, у Лынькова, праўда, аж роіцца, але ўсёждыкі — на наш пагляд — некаторыя словы Я. Колас да правінцыялізмаў залічае беспадстаўна. Словы напр.: не ўжадобку, згораць (згараваць, згарусьціць), петавацца (цяжка працаваць, мучыцца ў працы), вобмегам (мігам, вобміг, вобдух), рачанцы (стала азначаны час на яду), шуядзь, апоўзьлікі — спатыкаюцца ня толькі ў Усходняй Беларусі, але так-жа і ў Заходняй, як напр. у Ашмянскім павеце.

Не залічалі-б мы так-жа да русыцызмаў і гэткіх слоў і выражэньняў: павытапчуць (павытоптваюць), таюць (растаюць), павылезьлі (павылазілі), паклікаю (паклічу), памкнуўся было (памкнуўся быў). Беларускі народ часам і гэтак выражаецца.

Далейшае месца у зборніку-кніжцы „Пісьменнік і мова" займае артыкул „Мова і стыль лірыкі Міхася Чарота" — праф. Піотуховіча.

„У гісторыі беларускай літаратуры—кажа гэты прафэсар— Міхась Чарот па праву павінен заняць адно з найбольш відных і пачэсных месц. З яго іменем звязан працэс першапачатковага станаўлення і фармавання ў нас пролетарскай літаратуры, ён прынёс у нашу паэзію новыя бадзёрыя песьні—песьні барацьбы і перамогі...

Нацдэмаўскай рамантыцы мінулага Чарот супроцьстаўляе сваю пролетарскую рамантыку рэвалюцыйнага змагання...

Але ў ранняй творчасьці Чарота ёсьць і некаторыя цёмныя плямы: ў выніку клясава-чужых уплываў атрута буржуазнага нацыяналізму прасякла ў некаторыя яго вершы, асабліва пэрыяду польскай акупацыі. У М. Чарота эпізадычна вызначаліся матывы нашаніўскага адраджанізму, апяваньне „бацькаўшчыны",

як чагосьці суцэльнага. Аднак гэтыя цені не зьмяняюць агульнага сьветлага фону паэзіі Чарота, як вядучай накіраванасці...

У сваім надзвычайна моцным вершы „Суровы прыгавор падпісваю першым“ Чарот раскрывае самую сутнасьць нацыянал-дэмакратызму, яго рэстаўратарскую, інтэрвэнцыяніскую аснову. Пясьняр у словах, поўных вялікай злосьці і ненавісьці да класавага ворага, ганьбуе нацдэмаў, як служак капіталу, лакеяў імпэрыялістычнай буржуазіі, гандляваўшых крывёй працоўных, распрадаваўшых Беларусь капіталістычным драпежнікам і оптам і ў разброд“...

Паслушны сучаснай савецкай палітычнай догматыцы — ганьбіць і нішчыць беларускае нацыянальнае адраджэньне, спыняць і кляйміць у беларускім пісьменстве апяваньне бацькаўшчыны Беларусі, „як чагосьці суцэльнага“—праф. Піотуховіч, як бачым, робіць гэта дужа старанна. Ганьбіць ён патрыятычныя парывы ў паэзіі Чарота і, дабіраючы моцныя словы прыдуманых абвіненьняў пад адрасам беларускага нацыянальнага руху, аж пад неба выслаўляе тыя яго творы, якія зьвіняць у тон палітычным лёзунгам Саветаў. І толькі побач гэткіх „навуковых“ прыгрывак, праф. Піотуховіч сапраўды навукова і з яўным знаўствам справы гаворыць аб мове і стылю М. Чарота, якія ўносяць у беларускую паэзію новыя лексычныя элементы і ўзбагачваюць яе яркай мэтафарычнай вобразнасьцю.

У чародным артыкуле, „Мова ранней творчасці Якуба Коласа“, Ганна Базыленка падчырківае агульна ведамы факт, што ў гэным часе мова Коласа — гэта мова беларускага сялянства, якое ён прадусім і апяваў.

Пятро Глебка ў артыкуле „Аб мове пачынаючых пісьменнікаў“, зазначыўшы, што „трэба вучыцца ў лепшых майстроў нашай дарэвалюцыйнай літаратуры, як Купала, Колас, але да іх творчасьці трэба падыходзіць крытычна“, між іншым заяўляе, што „Самым важным для ўсей нашай савецкай літаратуры, у тым ліку і для пачынаючых пісьменнікаў, з'яўляецца змаганне за акасьць твораў, за чыстату, за сэнсавую дакладнасьць мовы“... Ну пэўне-ж, рабіць для мовы трэба хоць тое, што ў Саветах можна.

Янка Шарахоўскі ў арт. „Пра якасць паэтычнай мовы“ зварочвае асаблівую ўвагу на тое, што мова між іншым павінна верна адбіваць сапраўднае жыцьцё. „Вывучэньне літаратурнай тэхнікі — кажа ён — мае для пісменніка вялікае значэнне. Але тэхніка, нават высокая, не гарантуе ад творчай бяссільнасці. Яна—неабходная прадпасылка творчай работы, але не акрэслівае самой творчасці; творчасць пачынаецца там, дзе ёсць адносіны да рэчаіснасці“. Вось-жа гэты апошні сказ дужа няпэўны і рызыкоўны. Розная бывае гэная „рэчаіснасць“ і розна людзі да яе адносяцца. Творчасьць — мы-б сказалі — пачынаецца прадусім там, дзе даравітая душа чалавека мае магчымасьць ня толькі заглыбляцца сама ў сабе, але цалком свабодна адносіцца

да гэнай „рэчаіснасці“, як кажа Шарахоўскі, да акружаючага яго сьвету і свабодна выяўляць свае да яго адносіны. Пры існуючым-жа цяпер у Саветах палітычным рэжыме песьняры нашы як раз гэтай свабоды і ня маюць. Як у сярэднявеччы навука была „ancilla theologiae“ (слуга багаслоўя), так у Саветах сяньня паэзія ёсьць „ancilla politicae“ (слуга палітыкі).

С. Куніцкі ў арт. „Даволі „шындзёліць“ і „скогліць“ спосабам мітынгова-агітацыйным, пад відам ачышчэньня беларускай мовы, ганьбіць і глуміць у беларускай літаратуры ўсё, што ёсьць сапраўды беларускім, самастойным, як у слоўніку, так і ў стылю. „Бо—кажа—да гэтага імкнуцца беларускія нацыянал-дэмакраты, каб Беларусь Савецкуюператварыць у Беларусь Самабытную, каб адарваць яе ад братніх савецкіх рэспублік“... Аднак, праз палітычны туман у арт. Куніцкага можна часам дагледзіць і слушныя ўвагі што да слоў і стылю ў беларускай прыгожай літаратуры.

Не астаўся ў задзе ад іншых у зборніку-кніжцы і Эд. Галубок, якога там зьмешчаны артыкул пад назовам „Пытанні стылю беларускай савецкай драматургіі“. Падчыркнуўшы ведамую савецкую палітычную догму, што й беларуская драматургія павінна быць „нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зьместу“, а так-жа аддаўшы дань сучаснай савецкай расейскай палітыцы, цьвердзячы, што „цэлы рад нацдэмаўскіх драматургаў зводзіўся да адшукання гэтай своеадменнай і высокаякаснай беларускай мовы, адрозніваючыся па сваіх культурных адзнаках ад мовы расейскай і інш“, — Эд. Галубок у гэткім-жа дусе разглядае далей мову і стыль беларускіх драматычных твораў.

Апошнім ідзе артыкул П Юргілевіча — „Моўныя тэорыі і практыка контрэволюцыйных лідэраў „Узвышша“. Артыкул гэты —гэта грубая й вульгарная расправа з беларускімі пісьменнікамі, якія гуртаваліся каля часапісу „Узвышша“ і ў якім „замнога“ было беларускасьці, а так-жа расправа з беларускімі вучонымі, якія навукова працавалі над чысьцінёй беларускай мовы, над беларускай граматыкай і г. д. Але ў гэтай расправе спатыкаем і новую нотку. Дагэтуль, як мы бачылі, успомненыя аўтары папярэдніх артыкулаў, выпаўняючы маскоўскую палітыку, кляймілі самабытнасьць беларускай мовы і культуры дзеля таго, што яна адрозьнівае і аддзяляе Беларусь ад Расеі, а П. Юргілевіч кажа, што гэтая беларуская культурная самабытнасьць ня толькі аддзяляе Беларусь ад Расеі, але й „набліжае“ да мовы польскай. „Устаноўка нацдэмаў,—кажа ён—гэта стварэнне штучнага бар‘еру паміж беларускай мовай і мовай рускага пролетар‘яту і набліжэнне беларускай мовы да мовы фашысцкай Польшчы“... Ну, гэта ўжо сапраўды навіна, аб якой нікому і ня сьнілася і якая ёсьць „навуковым“ вынаходам П. Юргілевіча.

Далей аўтар гэтага артыкулу падае цэлы рад беларускіх архаізмаў, провінцыялізмаў і проста недарэчных слоў, якія быццам праводзяць у беларускую мову „нацдэмы“. Вось-жа сярод

гэных слоў, якіх тут памясьціць ня маем змогі, сапраўды ёсьць словы, якім у беларускай мове месца быць не павінна. Але гэта толькі выняткі і адносна гэтых выняткаў з Юргілевічам трэба згадзіцца, але што да агульных вывадаў яго, дык трэба сказаць, што яны навуковых падставаў ня маюць ніякіх, а толькі падставы маскоўскай палітыкі.

Урэшце канчаем. Ідэовая тэндэнцыя кніжкі „Пісьменнік і мова“—гэта падвод пад асыміляцыю беларускай мовы з мовай расейскай, гэта стварэньне псыхозы ў беларускага савецкага пісьменьніка патрэбы служэньня сваім літэратурным творствам маскоўскай палітыцы.

Ня гледзячы аднак на гэта, кніжка „Пісьменнік і мова“ не пазбаўлена сваей вартасьці. Яна клясычна малюе адносіны Саветаў да беларускай літаратуры і мовы, а так-жа, хоць у вузкім і аднабокім асьвятленьні, парушае справы ў беларускім літаратурным творстве, якія так мала ў нас распрацаваны, а якіх распрацоўка зьяўляецца неабходнасьцю для разьвіцьця беларускай мовы і беларускага прыгожага пісьменства.

Ад. Станкевіч.

Др. Я. Станкевіч: АПЫТАЛЬНІК да зьбіраньня дыялектычных і некаторых агульных асаблівасьцеў беларускага (крывіцкага) языка. Выданьне Таварыства Прыяцеляў Беларусаведы пры У. С. Б. ў Вільні. Вільня 1935, бачынаў 48.

Заданьнем „Апытальніка“ ёсьць сабраньне асаблівасьцяў паасобных дыялектаў беларускае мовы ў Заходняе Беларусі, каб пры помачы набытага матар'ялу: a) даведацца простор пашырэньня часьці выданых ужо асаблівасьцеў беларускага языка, b) устанавіць быцьцё некаторых зьяваў бел. языка і азначыць простор іх пашырэньня; c) адкрыць некаторыя законы беларускага языка і тэндэнцыі ў ім.

Гэтыя мэты, якім служаць дыялектолёгічныя досьледы наагул, могуць быць у лацнай меры зьдзейсьнены шляхам грунтоўных і шырокіх адказаў - на паасобныя пытаньні „Апытальніка“, укладзенага вельмі старанна беларускім языкаведам др. Я. Станкевічам. Паасобныя пытаньні апрацаваныя вельмі дакладна; у іх зьвернена належная ўвага на ўсе асаблівасьці беларускага языка на прасторы Заходняе Беларусі, а так-жа амаль усяе этнографічнае Беларусі наагул. У „Апытальніку“ найбольш дакладна апрацавана фонэтыка й морфолёгія, значна меней сінтакс і слоўнік. Аб паўніні языковых зьяваў, прадугледжаных у „Апытальніку“, можа сьведчыць хоць-бы лік пытаньняў, якіх ёсьць 213; незалежна ад гэтага аддзел слоўніковы мае 32 пытаньні.

Выданьне Т-вам Прыяцеляў Беларусаведы „Апытальніка“ трэба ўважаць за зьявішча вельмі дадатняе.

„Апытальнік“ укладзены вельмі ясна й даступна, могуць ім карыстацца ня толькі языкаведы, але й кожны беларускі інтэлігэнт.

В—іч.

PIEŚNI LUDOWE *Ziemi Wileńskiej i Nowogródzkiej*, zebrała Bronisława Gawrońska. Wilno 1935 r.

KUPAŁA (Noc świętojańska), uroczystość ludowa z czasów dawnych w ziemi Nowogródzko-Wileńskiej obchodzona. Tekst uroczystości, na miejscowych źródłach etnograficznych oparty, opracowała Wanda Dobaczewska, motywy muzyczne ludowe dobrała Bronisława Gawrońska. Wilno 1935 r.

„Нідзе ў іншай частцы Польшчы не спаткаем такіх рознародных песьняў народных, як у Віленшчыне і Наваградчыне, а гэта таму, што яны складаюцца ня толькі з песьняў польскіх, але так-жа беларускіх, літоўскіх, татарскіх і караімскіх“.

Так пачынаецца прадмова да зборніка „Pieśni ludowe ziemi Wileńskiej i Nowogródzkiej“, выданага коштам пазашкольнага аддзелу Віленскае Куратрыі.

Далей ідзе мова аб тым, што песьні гэтыя сьпяваюцца па вёсках і засьценках, як бы датасаваныя да пэйзажу, поўнага чароўнай прыгожасьці і „спэцыфічнай асаблівасьці“.

Сказана вельмі хораша.

Ня было-б нічога дзіўнага, калі-б гэтая прадмова і наагул усё выданьне ня мела іншых спэцыфічных мэтаў, якія зусім нічога ня маюць супольнага з праўдзівым захопленьнем хараством народнай песьні.

Паводле гэтага зборніка выглядае, што на нашых землях шырокія пералівы народнай песьні маюць польскі характар, польскі дух, а беларуская песьня побач з літоўскай, караімскай і татарскай (чамусьці жыдоўскую забыліся дадаць) толькі спадарожнічае з польскімі песьнямі.

У сапраўднасьці-ж, калі пакінуць на баку народную творчасьць літоўскую і ўслухацца ў мэлёдыйную мову Віленшчыны і Наваградчыны, то ў гэтым нязьмераным яшчэ акіяне беларускіх народных песьняў зусім і бясьсьледна патонуць песьні ня толькі караімскія ці татарскія, але нават польскія.

Нічога тут не паможа і тое, што аўтар зборніка паклікаецца на кампазытара Мечыслава Карловіча і яго „Рапсодыю“, названую, замест этнографічнага, традыцыйным тэрмінам „Літоўская“. Ня варта было аўтару сарамліва хавацца перад тым фактам, што „Рапсодыя“ мае ў аснове беларускую народную песьню, але ніяк ня польскую, караімскую ці нават літоўскую. Мэлёдыя, поўная „задумы і нядолі“, аб якой гаворыць Карловіч, —

беларуская жніўная песьня з Дзісьненшчыны, а „wiekuista niedola“—гэта-ж паншчына і нацыянальны ўціск.

У зборніку 50 песьняў: 16 польскіх, 25 беларускіх і 9 літоўскіх.

Калі з польскіх адкінуць „Wilju“, якая не зьяўляецца арыгінальным народным творам, а компіляцыяй з польскага касьцельнага гымну „Boże, coś Polskę“ і баўгарскага „Шумі Марыца“, ды яшчэ беларускую валачобную песьню „Вечар добры, паненачка“ (валачобныя сярод славянскіх народаў ёсьць толькі ў беларусаў) і „У зялёным гайку“ з вольным тэкстам у „вэрсыі народнай, то польскіх песьняў, аб якіх піша прадмова, будзем мець толькі 13.

Пры тых адумысловых мэтах, на якія разьлічаны зборнік і пры матар'яльных магчымасьцях Куратарыі, ня так пісалася-б аб польскіх песьнях, калі-б яны сапраўды так шырака разьліваліся на нашых беларускіх землях. Тады ня прышлося-б дадаваць польшчыне беларуска - літоўскія і караімска - татарскія падпоркі.

Калі-б сапраўды Куратарыі залежыла на пашырэньню беларускай песьні, як узгадаваўчага дзейніка для моладзі, не патрэбна было-б польскага тэксту побач з беларускім. Для сьвятліц варбуецца пераважна беларуская вясковая моладзь, якая сваю родную песьню хутчэй патрапіць навучыцца, чымся польскую, або папольску. Апрача таго пераклады, найчасьцей зусім няўдалыя, толькі калечаць народную паэзію.

Пры сучасных тэндэнцыях польскіх культуртрэгераў іначай ня можа быць: яны ўважаюць, што калі беларуская песьня выйдзе ў сьвет з польскае ўстановы спалянізаванай, то тым самым хутчэй удасца выцісьнуць беларусаў з культурна - мастацкай галіны працы.

Досыць наіўным выглядае падаваньне матываў, што сьпеўнік мае на мэце пазнаёміць з харастам Віленска - Наваградзкае песьні народнай (чаму не беларускай і літоўскай?) іншыя „дзяльніцы“ Польшчы.

Такім „кустарным рамяслом“, далёкім, як прызнаецца сам аўтар, ад „музыкалёгічнай сьцісласьці“, хіба нікога ня зьдзівіш.

Аднагалосны прымітыў разьлічаны як раз толькі на шырокія нізы народныя і мае мэты праводзіць не музычна-сьпявацкую культуру, як такую, а наадварот—пры дапамозе гэтай культуры, пры дапамозе песьні нясьці польскасьць, бароцца з народнай беларускай стыхіяй.

Наступнае ў такім-жа родзе выданьне тае-ж Куратарыі „Купала“—поўнасьцю пацьвярджае зроблены намі вывад.

Сваім зьместам гэта мела быць „Купальская урачыстасьць“, абапёртая на этнографічных крыніцах Наваградчыны і Віленшчыны. У сапраўднасьці этнографічнага там толькі і ёсьць, што на-

зоў кніжкі ды падагнаныя народныя мэлёдыі. Папросту кажучы, „праца“ гэтая—„Купальле“ Дуніна-Марцінкевіча, перакладзенае на польскую мову. Пры чым аб гэтым нават ні разу і нідзе ня ўспомнена. Пацыху ды памалу зроблены звычайны плягіят.

На 18 мэлёдыяў, якімі перасыпаны тэксты „Купальскай урачыстасьці“, толькі для „Лявоніхі“ зроблены вынятак, якая прызнаецца за танец беларускі, а рэшта мэлёдый паданы з польскімі тэкстамі, як мэлёдыі польскія. Пры чым сапраўднай купальскай мэлёдыі няма ніводнай.

Усе мэлёдыі запазычаны з наступных беларускіх выданьняў:

1. „Бѣлорусскія народныя мелодіи“, Е. Раманова,
2. „Беларускія народныя песьні“, Г. Шырмы,
3. „Беларускі песеньнік“, Л. Рагоўскага,
4. „Песьні Віленшчыны“—(беларускія) Ст. Казуры.

І аб гэтым ані словам нідзе ня ўспомнена. Натуральна, такі „недагляд“ зроблены не прыпадкова. Пры кожнай песьні паказана, скуль яна паходзіць, толькі народную прыналежнасьць „забыліся“ падаць.

Дзеля таго, што нашыя землі проста „рояцца“ ад песьняў польскіх, літоўскіх, караімскіх, татарскіх, то найлепей распазнаваць іх народную прыналежнасьць паводле тэкстаў.

З успомненых „працаў“ польскіх аўтараў беларускай інтэлігенцыі неабходна зрабіць свае вывады. На працягу вякоў народ бараніўся ад нацыянальнай сьмерці, між іншым, і такім аружжам, як родная песьня. Гэтае прыгожае аружжа трэба пераняць з рук народных і паказаць усяму сьвету, а ў першую чаргу сваім праціўнікам, што мы існуем, будзем існаваць і... бароцца.

К. Р—іч.

DIE WESTRUSSISCHE Kanzleisprache des Grossfürstentums Litauen von Chr. S. Stang. Выданьне Нарвэскай Акадэміі Навук. Ослё 1935. Фармат 8⁰, бач. 166.

Вельмі вартасная, грунтоўная і сумленная праца нарвэскага вучонага Хр. Станга „Die Westrussische Kanzleisprache des Grossfürstentums Litauen“ („Беларуская мова канцэлярыі вялікіх князёў літоўскіх“) зьяўляецца доказам зацікаўленьня навуковага сьвету заграанічнага культурай Беларусі ў мінуўшчыне. Праца напісана ў нямецкай мове. Зьмяшчае многа тэкстаў у старой беларускае мове. Апёрта на багатым гістарычным матарыяле. Характар яе, як відаць з назову і зьместу, спэцыяльны—філёлёгічны.

Праф. Хр. Станг два разы (у1931 і 1932 г.) адведаў Заходнюю Беларусь дзеля вывучэньня сучаснай беларускай мовы безпасрэдна ад народу. *Н.*

Хроніка

Літаратурны конкурс.

„Шлях Моладзі", месячны часапіс беларускай моладзі (выходзіць у Вільні рэгулярна ўжо 7-мы год) сёлета вясной абвясьціў конкурс на найлепшае апавяданьне, пры гэтым вызначыў тэрмін прысыланьня апавяданьняў да 30-га верасьня. На конкурс прыслана 15 новэлек.

Гарманізацыя беларускіх песьняў.

Заслужаны для беларускай музычнай культуры, слаўны кампазытар А. Грэчанінаў (ад некалькі год стала пражывае ў Парыжы) ужо аддаўна з энтузыязмам гарманізуе беларускую народную песьню. Сёлета вясной кампазытар Грэчанінаў згарманізаваў 10 народных песьняў і апошнім часам распачаў гарманізацыю новых, з ліку 70, якія запісаў і пераслаў яму ведамы беларускі культурны дзеяч і рэгент бел. хору гр. Р. Шырма.

Два канцэрты беларускай песьні ў радыё.

Віленская радыёстанцыя надала (праз усе радыёстанцыі ў Польшчы) сёлета два канцэрты беларускай песьні. Першы адбыўся дня 11-га траўня, другі – 26-га чэрвеня. У праграму канцэртаў уваходзілі выключна беларускія народныя песьні. Гр. К. Шырміха—салістка—і Хор пад кіраўніцтвам гр. Р. Шырмы, як выканаўцы праграмы, выпаўнілі свае ролі вельмі добра.

Міма неадпаведнага часу, у якім надаваліся канцэрты (15 гадзіна), многія з беларусаў і небеларусаў, у краі і заграніцай, маглі пачуць беларускую народную песьню, пазнаць яе хараство.

Гр. Р. Шырма, як даведываемся, рыхтуе рэпэртуар да новага бел. канцэрту, які незадоўга будзе надаваць таксама віленская радыёстанцыя.

Беларускія рэфэраты на зьезьдзе гісторыкаў.

У верасьні месяцы адбыўся ў Вільні VI-ты зьезд польскіх гісторыкаў. Зьезд патрываў некалькі дзён. Зьезд абгаварываў праблемы, зьвязаныя з культурай, правам, навукай і палітыкай у Вялікім Княстве Літоўска-Беларускім. На зьезьдзе выступаў з прамовай у беларускай мове гр. А. Луцкевіч, ён-жа і гр. В. Грышкевіч прачыталі, у польскай мове, па адным беларускім рэфэраце.

Беларуская песьня ў Празе Чэскай.

22-га чэрвеня ў Празе Чэскай адбыўся ўкраінска-беларускі канцэрт песьні. Украінскі хор з учасьцем беларусаў і чэскія сьпявачкі выканалі цэлы рад і беларускіх песьняў. На канцэрце былі прысутнымі выдатныя чэскія музыкі, вучоныя, палітыкі і інш. дзеячы, на каторых беларуская песьня сваім хараством і мілагучнасьцю зрабіла сільнае ўражаньне.

„Іскры Скарыны".

Беларуская калёнія ў Празе Чэскай дастойна трымае беларускі нацыянальны сьцяг, сьцяг барацьбы за інтарэсы Беларусаў, як нацыі.

Доказам гэтага — выданы сёлета, саматужна і ахвярна, чарговы 5 ты нумар часапісу „Іскры Скарыны", які рэдагуе Беларускае (Крывіцкае) Культурнае Т-ва ім Фр. Скарыны. (Адр.: ČSR, Praha-Dejvice, čp. 548).

Выгляд часапісу паважны, рэпрэзэнтацыйны, фармат вялікі, зьмест багаты і align разнастайны.

Юбілей Янкі Купалы.

28 траўня 1905 г. у газэце „Севѣро-Западный Край" надрукаваны першы верш Янкі Купалы „Мужык". Сёлета, дзеля гэтага, прыпаў 30-цілетні юбілей літаратурнай працы Купалы. З прычыны юбілею адбыліся ў БССР., галоўным чынам у сталічным горадзе Менску, адпаведныя ўрачыстасьці, а ў газэтах Сав. Беларусі, як і іншых сав. рэспублік, надрукаваны артыкулы аб Купале і ягонай творчасьці.

28-га траўня адбыўся ў Менску, у Доме Пісьменьніка, юбілейны вечар, з учасьцем юбіляра.

З дакладамі на вечары выступалі: старшыня Саюзу Сав. Пісьменьнікаў БССР Клімковіч і Кучар. Яны гаварылі аб творчым шляху Купалы і аб тым, як Купала „уключыўся" у савецкую літаратуру і соцыялістычнае будаўніцтва. На вечары юбіляра віталі прадстаўнікі камуністычнай партыі, савецкіх установаў, літаратурных і пісьменьніцкіх арганізацыяў, як беларускіх, так і іншых народаў Сав. Саюзу, — паасобныя пісьменьнікі і поэты, прадстаўнікі навукі, культуры, мастацтва і інш.

Па дакладах і прывітаньнях сказаў прамову Купала, выказваючы ў ёй паміж іншым патрыётызм і вернасьць да „неабсяжнай бацькаўшчыны—краіны саветаў", а так-жа тое, што „добра жыць, тварыць і змагацца ў эпоху мудрага Сталіна"!

Увесь зьмест прамовы паказвае, што яна была здаваньнем экзамену Купалы з ягонай камуністычнай дасьпеласьці і прававернасьці перад камуністычнымі ўладамі.

Савет Народных Камісараў БССР нагародзіў народнага поэта Купалу за ягоную дзейнасьць на літаратурнай ніве ў апошнім часе лёгкім аўтамабілем.

Гэтак было вясной. Згодна з пастановай Саюзу Сав. Пісьменьнікаў Сав. Беларусі, які зьяўляецца галоўным арганізатарам юбілейных урачыстасьцяў, найважнейшыя ўрачыстасьці адбудуцца ўвосень. Дзеля іх арганізацыі пакліканы адумысловы камітэт.

Зразумелая рэч, што Купалаўскі юбілей не зьяўляецца аказіяй дзеля выражэньня спэцыяльна пашаны для юбіляра, ёсьць ён аказіяй дзеля выкарыстаньня передавога поэта Беларусі Купалы для палітычных агітатарскіх мэтаў камуністычнай улады, дзеля апраўданьня сав. нацыянальнай палітыкі ў адносінах да Беларусаў,—палітыкі нішчэньня Беларусаў, як нацыі.

Юбілей Зьмітрака Бядулі.

23-га кастрычніка адбылося ў Менску ўрачыстае сьвяткаваньне 25-цілецьця літаратурнай творчасьці Зьмітрака Бядулі, беларускага пісьменьніка, з паходжаньня жыда (запраўднае ягонае імя і прозьвішча Самуіл Плаўнік). Быў зарганізаваны адумыслвы вечар, на якім з дакладам аб творчасьці Бядулі выступіў Кучар, а сам Бядуля сказаў доўгую прамову, якая нічым іншым не зьяўляецца, як чарговым пакаяньнем прамоўцы перад камуністычнымі ўладамі за свае нядаўныя „нацыяналістычныя грахі" ў творчасьці,—актам абвінавачаньня бел. нацыянальных дэмакратаў і пакорнай чалабітнасьцю перад камуністычнымі ўладамі.

Літаратурны зборнік маладых пісьменьнікаў і поэтаў Сав. Бел.

Падрыхтаваны і зданы ўжо ў друк Кабінэтам Маладога Аўтара пры Саюзе Сав. Пісьменьнікаў Беларусі літаратурны зборнік маладых пісьменьнікаў і поэтаў Сав. Беларусі

Мікола Хведаровіч у артыкуле „Расьце маладая поэзія" („Літаратура і Мастацтва", № 46, 1935 г.), зазначае, што моладзь, якая бярэ ўчасьце ў гэтым зборніку, здольная, — „што гэтыя людзі не выпадковыя ў літаратуры, калі яны і надалей будуць сур'ёзна працаваць над разьвіцьцём свайго поэтычнага таленту і над падвышэньнем культурнага ўзроўня".

У зборніку знаходзяцца творы восемнаццаці аўтараў: А. Бурдзеля, Пімена Панчанкі, Бацюшкава, М. Сяднёва, Бачылы, М. Калачынскага,

Матэўшава, Леанідава, Пацёмкіна, Гаўрылы Нячая і інш.

Не папалі ў зборнік здольныя пачынаючыя поэты: М. Жук, які працуе ў Случчыне, Шакаль — працуе ў Магілёве, Купершток, Мялешка—працуюць у Менску, Левановіч, Ротміль—у Гомлі, М. Гваздоў—у Чэрыкаве. Гэта моладзь, „перад якой вялізарныя пэрспэктывы творчага росту"—кажа той-жа Хведаровіч.

У Беларускай Акадэміі Навук.

— Інстытут Гісторыі БАН падрыхтаваў да друку вялікі зборнік, прысьвечаны гісторыі, археолёгіі і этнографіі Беларусі. У зборнік увайшлі артыкулы: „Паўстаньне ў 1863 г. у Беларусі", „Фальклёр у сьвятле клясавай барацьбы", „Контрэволюцыйная дзейнасьць беларускіх нацдэмаў у часе нямецкай акупацыі", „Дасьледаваньні аб старым Менску" і рад іншых артыкулаў.

— Інстытут Літаратуры і Мастацтва выдаў збор твораў беларускага поэты Паўлюка Труса. Гэта другое выданьне. Першае (з 1934 г.) разышлося. Другі збор твораў, як і першы, выйшаў пад рэдакцыяй акад. І. Замоціна і праф. М. Піотуховіча.

— Інстытут Нацыян. Меншасьцяў Бел. Акад. Навук. склаў латышска-беларускі практычны слоўнік, які зьмяшчае каля 20.000 слоў.

Усебеларускі зьезд савецкіх архітэктараў.

У другой палавіне чэрвеня (ад 24 да 27) адбыўся ў Менску першы ўсебеларускі зьезд савецкіх архітэктараў. Брала ўчасьце ў ім 110 дэлегатаў. Зьезд абгаварываў справы зьвязаныя з архітэктурай у БССР і заданьні гэтай архітэхтуры на будучыню, а так-жа справы арганізацыйныя.

У справах арганізацыйных, зьезд зацьвердзіў статут Саюзу Сав. Архітэктараў БССР, выбраў улады саюзу і дэлегатаў на 1-шы Усесаюзны Зьезд Сав. Архітэктараў, які адбудзецца ў сьнежні месяцы сёлета.

Усебеларуская алімпіяда самадзейнага мастацтва.

У часе ад 21 да 25 чэрвеня сёлета ў Менску адбылася ўсебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасьці.

У алімпіядзе бралі ўчасьце: 7 драматычных гурткоў, 12 музыкальных і 12 харавых, 35 выканаўцаў песень, 25 выканаўцаў музыкі, 21 танцор і інш. Усіх учасьн. было каля 1000 ч.

Выстаўка беларускага пэйзажа—абразоў В. І. Галубка.

В. І. Галубок ведамы беларускі артыст, драматург, рэжысор, кіраўнік беларускага аб'езнага тэатру, вобак працы ў кірунку драматычным аддаўна працуе ў жывапісі. Ён—мастак-самавучак. Любуецца ў беларускай прыродзе і пераносіць малюнкі гэтай прыроды на палатно.

У пачатку кастрычніка, у Доме Пісьменьніка ў Менску адкрылася выстаўка беларускага пэйзажа-абразоў Галубка. Выстаўлены 31 абраз.

Мастак В. Волкаў, крытыкуючы выстаўку („Літаратура і Мастацтва" № 55, Менск 1935 г.) так кажа аб Галубку і ягоных абразох: „Галубок першы раз выступае перад грамадзкасьцю ў якасьці жывапісца і, трэба адзначыць, выступае ня дрэнна. Яго творчасьць перарастае рамкі звычайнага аматарства — у некаторых яго малюнках відаць сапраўднае майстэрства... Яго палотны жыццерадасныя, бадзёрыя, фарбы, часамі, дасягаюць вялікай яснасьці, празрыстасьці і добра перадаюць матарыял"...

Выдавец: Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры

Рэдакцыйная Калегія: М. Шкялёнак, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, А. Бярозка і Я. Шутовіч.

Адказны Рэдактар: Ян Шутовіч.

Прысланыя кніжкі і часапісы.

Wincuk Adważny, Chłapiec, повесьць. Бач. 244. Вільня 1935.
А д. Станкевіч, Прафэсар Браніслаў Эпімах-Шыпіла. Бач. 24. Вільня 1935
W. A., Kazka ab rybaku i rybcy. Бач. 32. Вільня 1935.
A. Stepowič, Za baćkaŭščynu. Бач. 24, Вільня 1935.
М. Машара, На прадвесьні, Ізборнік вершаў. Бач. 92, Вільня 1935.
„ „ Вясельле. Бач. 24, Вільня 1934.
Др. Я. Станкевіч, „Апытальнік". Бач. 48. Вільня 1935.
„Студэнцкая Думка", № 1, Вільня 1935.
Rocznik Wydziału Filozoficznego Uniwersytetu Jagiellońskiego, t. I, zeszyt 1 i 2, 1930—1934, Kraków 1935.
Ярослав Гординський, Сучасне Франкознавство (1916—1932), Львів 1935.
Володимир Безушко, Віл'ем Шэкспір—рэспубліканець? Львів 1934.
Ів. Кревецький, Бібліотека Наукового Товариства ім' Шэвчэнка у Львові, Львів 1923.
Володимир Гнатюк, Наукове Товариство имени Шэвчэнка, з нагоди 50-ліття його заснованьня (1873—1923), Львів 1923.
Михайл'а Возняк, Хто-ж автор т. зв. Літопісу Самовидца? Львів 1933.
Альманах українськіх богословів, Львів 1934.
Богословія, кн. 2—3, Львів 1935.
Дзвони, ч.ч. 8—9, 10, Львів 1935.
Рідна Мова, ч.ч. 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11, Варшава 1935.
Наша Культура, кн. 4, 5, 6, Варшава 1935.
Вістнік, кн. 7—8, Львів 1935.
Український Бэскід, ч.ч. 20—36, Перемишль 1935.
Orientalia Christiana periodica, n.n. I—II, III—IV, Roma 1935.
Slovansky prehled, č.č. 2, 3, 4, 6, 8, Praha 1935.
Prehled, č. 1—16, Praha 1935.
Život, č. 15—16, 17, 18, 19—20, Praha 1935.
Sprawy Narodowościowe, № 1—2. Warszawa 1935.
Włóczęga, №№ 1—4, Wilno 1935.
Pax, №№ 1—13, Wilno 1935.
Oriens, №№ 1—5, Kraków 1935.
Poprostu, №№ 1—7, Wilno 1935.
Lietuviskas Baras, № 2, 1935, Vilnius.

Ад Рэдакцыі:

— Выхад трэцяй кніжкі „Калосься" з незалежных ад рэдакцыі прычын спозьніўся.

— У асабовым складзе Рэдакцыйнай Калегіі наступіла зьмена: на мейсца гр. Ст. Станкевіча ўвайшоў поэт А. Бярозка.

— Усіх супрацоўнікаў рэдакцыя просіць найхутчэй прысылаць матар'ялы ў наступную кніжку „Калосься".